№ 25 (670) 7 ліпеня 2010 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**22-гадовы беларус патануў у ЗША**

Старонка 2



**Пагоня вярнулася ў Глыбокае**

Старонка 2



**Мабільнікі на дзве сімкі за $100 — браць ці не?**

Старонка 15



## У НУМАРЫ

**Мытная пастка**

Мэта «саюза траіх» — падпарадкаванне беларускай эканомікі Расіі. Піша Віталь Сіліцкі. **Старонка 7.**

**Мытны саюз — найвялікшы геапалітычны правал апошніх гадоў**

Каментуе Павал Севярынец. **Старонка 7.**

**Да Бога праз міліцэйскія кардоны**

Будслаўскі фэст — 2010: абсурдныя ператрусы на турнікетах. **Старонка 11.**

**Героі эпохі Грунвальда**

Гісторыя Беларусі. **Старонка 10.**

ТУРЫСТЫЧНАЕ АГЕНЦТВА
«ГІСТОРЫЯ-ТУР»
- Тур на фестываль «Гальшанскі замак», 21.08.2010 (папярэдні продаж квіткоў і арганізаваная дастаўка транспартам)
- Аўтобусныя экскурсіі па Беларусі
- Адпачынак у Еўропе і на моры
- Карпаратыўны адпачынак у шляхецкім фальварку Карчэўскіх, што ў Бянюнах
- Шэнгенскія візы
(029) 677 00 46 www.h-t.by

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Хросны бацька капітуляваў

**На 15-ы дзень пасля ультыматуму Мядзведзева Беларусь ратыфікавала Мытны кодэкс. Мінск не дабіўся ніводнай саступкі. Нізкія мыты на ўвоз аўтамабіляў захаваюцца толькі на год.**




Гісторыя з прыняццем дакументаў Мытнага саюза нагадвала шпіёнскі фільм. 29 чэрвеня палата прадстаўнікоў сабралася на сваё апошняе паседжанне летняй сесіі. У парадку дня не было пытання аб ратыфікацыі Мытнага саюза.

Журналісты бачылі, як дэпутаты выходзілі з Авальнай залы. Было абвешчана, што сесія скончаная. Насцярожыў толькі факт, што не быў выкананы абавязковы ў такіх выпадках дзяржаўны гімн.

Потым высветлілася, што пасля абеду дэпутаты абедзвюх палат таемна ратыфікавалі ўсе пагадненні. Прычым на наступны дзень ніводзін з дэпутатаў не прызнаваўся ў гэтым. А вядома пра ратыфікацыю стала толькі з расійскіх СМІ.

Ад каго хаваліся абраннікі народныя? Ад самога народа, які незадаволены павышэннем мытаў на аўтамабілі, ці ад Расіі?

На Дзень рэспублікі Лукашэнка ўзвінчана паведаміў: «Што датычыць Мытнага саюза, то вельмі шкада, што прэзідэнт саюзнай дзяржавы не ведае, што адбываецца ў Мытным саюзе. Павінен вам сказаць, што мы ні на ёту не зрабілі кроку назад, ні на міліметр не адстаем у Мытным саюзе ні ад Расіі, ні ад Казахстана. Мы на сённяшні дзень ратыфікавалі ўсе дамовы і пагадненні, якія датычаць Мытнага саюза. Але яны гэтага не ведаюць. Гарантыю вам даю, што не ведаюць».

**Працяг на старонцы 3.**

# НТВ прынізіла Лукашэнку

**Напярэдадні саміту кіраўнікоў Беларусі, Расіі і Казахстана ў Астане расійскі тэлеканал НТВ паказаў «Хроснага бацьку» — фільм пра асабістае жыццё кіраўніка Беларусі і знікненні людзей.**

Кіно выйшла ў рамках перадачы «Чыстасардэчнае прызнанне».

З самага пачатку тэлевізійнікі падкрэслілі,з якімі цяжкасцямі і рызыкай давялося сутыкнуцца пры падрыхтоўцы фільма. Выйсці ён мусіў яшчэ год таму, але спецслужбы Беларусі канфіскавалі касеты, а саміх журналістаў дэпартавалі з краіны. Тым не менш, знайшліся людзі, якія змаглі знайсці стужку ў сейфах КДБ і вярнуць назад НТВшнікам. Такая легенда прагучала на пачатку фільма.

Стужка пачынаецца архіўнымі здымкамі 1996, калі адбывалася прэзентацыя «Габелена стагоддзя» Аляксандра Кішчанкі. Мастак адлюстраваў на габелене найбольш знакавыя постаці XX стагоддзя, сярод якіх быў і Лукашэнка.

Малады кіраўнік дзяржавы на гэта тады сказаў на трасянцы: «Вот ана жызнь. Вот ано іскуства ісціннае». З першых кадраў аўтары падводзяць да думкі, што Лукашэнка — самазакаханы, неразумны, ілжывы і беспрынцыповы чалавек.

Упершыню на расійскім ТВ прагучала інфармацыя пра асабістае жыццё кіраўніка дзяржавы.

**Працяг на старонцы 8.**




Стыпендыяльная праграма Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча «Gaude Polonia»

Нацыянальны цэнтр культуры аб'яўляе конкурс на атрыманне стыпендыі на шасцімесячны курс навучання ў Польшчы ў рамках стыпендыяльнай праграмы Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча «Gaude Polonia». Праграма «Gaude Polonia» прызначаецца для маладых дзеячаў культуры і перакладчыкаў з краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Курс навучання ў Польшчы пачнецца 1 лютага і будзе доўжыцца да 31 ліпеня 2011. Набор удзельнікаў ажыццяўляецца на конкурснай аснове. Кандыдаты павінныя валодаць польскай мовай на базавым узроўні.

Заяўкі прымаюцца да 15 кастрычніка 2010.

Падрабязную інфармацыю аб праграме і бланкі анкет можна атрымаць на інтэрнэт-старонцы www.nck.pl/kategoria/234/gaude-polonia/pr/true, а таксама ў польскіх дыпламатычных прадстаўніцтвах у Мінску і ў Нацыянальным цэнтры культуры ў Варшаве (тэл. +48 22 210 01 21).

# У Глыбокае вярнулася Пагоня

На гэтым тыдні на сцяне глыбоцкага 7-павярховага Дома саветаў усталяваныя два вялікія білборды. На левым — герб Віцебскай вобласці «Пагоня», на правым — герб Глыбокага.

Дзіўнага тут нічога няма, хаця ў некаторых «дах едзе» ад нечакана ўбачанага відовішча. Не можа быць! Нашыя вярнуліся? Дзіўней было б у Лепелі, бо там трэба вешаць аж дзве Пагоні. Адна другую даганяе! Бо цяперашні герб горада Лепеля — таксама Пагоня.

На тле глыбоцкага «Белага дома» цяпер аж пяць сімвалаў. Два — вышэйзгаданыя, а таксама герб РБ, сцяг РБ і сцяг горада, срэбна-блакітна-жоўты.

Блакітным колерам на сцягу горада адзначаная зубчатая крапасная сцяна (як і на гербе), бо некалі тут быў замак Радзівілаў. Але дзіва, што і на гербе горада «польскіх» часоў, пра існаванне якога даведаліся толькі год назад (дзякуючы таму, што польскія архівы сталі даступныя праз інтэрнэт) — таксама зубчатая 3-пралётная гатычная брама.

Цікава, аднак, тое, што Глыбокае заўсёды было пад Пагоняй! Гэта цяпер — з 1961 — Глыбокае належыць да Віцебскай вобласці. Але ж Глыбоччына — колішняя Віленшчына. А герб Віленскай губерні (ваяводства) — таксама Пагоня.

**Уладзімір Скрабатун, Глыбокае**




**Падчас святочнага шэсця, прымеркаванага да Дня незалежнасці, у Віцебску на пілотках некаторых школьнікаў можна было бачыць цэшкі з Пагоняй.**
**Як патлумачылі дзеці, яны належаць да арганізацыі «Хуткая дарожная дапамога», дзе вывучаюць рэгуляванне дарожнага руху і прыёмы першай дапамогі, а на форменных пілотках у іх — герб Віцебскай вобласці.**
**Нагадаем, што 2 чэрвеня 2009 Аляксандр Лукашэнка ўказам №277 зацвердзіў герб Віцебскай вобласці з вывай Пагоні. Таксама вывва гэтага герба змяшчаецца на знаку «Чалавек году Віцебшчыны».**

## Самае чытанае на nn.by за 30 чэрвеня—6 ліпеня

- НТВ паказала фільм пра асабістае жыццё Лукашэнкі і знікненні людзей
- Дзе жыве Лукашэнка?
- Ці свята для вас 3 ліпеня?
- Да Бога праз міліцэйскія кардоны
- Рыцар з чырвона-зялёнай стужкай
- Казакі ў часе шэсця 3 ліпеня
- Расійскае ТВ нагадала Лукашэнку пра лёс Бакіева
- Мытная пастка
- Па Вільні будзе ездзіць беларускі тралейбус «Вітаўт» + фота
- Першы год першага беларускамоўнага міністра

## nn@nn.by

Лукашэнка: «Мы на сённяшні дзень ратыфікавалі ўсе дамовы і пагадненні, якія датычаць Мытнага саюза. Але яны гэтага не ведаюць. Гарантыю вам даю, што не ведаюць».

Ну, а наш-та, «ваўкадаў»,
зноўку ўсіх наўкол пацешыў:
ночкай боты аблізаў,
зранку урачыста брэша,
што, маўляў, ён ашукаў абармотаў.
Не заўважыў гаспадар чыстых ботаў!

**Кнехт**

## Сцісла

**• Шушкевіч атрымаў найвышэйшую ўзнагароду Літвы.** Крыж Камандора ордэна Вітаўта Вялікага яму ўручыла прэзідэнт краіны Даля Грыбаўскайце. Былы старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі ўганараваны за актыўную падтрымку незалежнасці Літвы ў 1991 г.

**• Месца нараджэння Ларысы Геніюш увекавечаць?** Мінкультуры ў канцы ліпеня вызначыцца, ці надаваць статус помніка рэшткам фальварка Жлобаўцы, у якім нарадзілася паэтка Ларыса Геніюш. З такой прапановай у міністэрства звярнулася Таварыства аховы помнікаў. Днямі Зэльвенскі райвыканкам адмовіўся назваць імем паэткі вуліцу раённага цэнтра, дзе паэтка жыла.

**• Дзяўчына, якой нанеслі пабоі, аштрафаваная на 350 тысяч.** Такое рашэнне вынесла суддзя Ленінскага раёна Магілёва Святлана Сарока, разгледзеўшы пазоў валанцёра кампаніі «Гавары праўду» Аксаны Самуйлавай. Аксана раздавала зарэгістраваную газету «Свабодныя навіны плюс» ля завода «Ліфтмаш». Па яе словах, начальнік аховы прадпрыемства Шулаў адабраў у дзяўчыны газеты і перадаў яе міліцыі. Дзяўчына зрабіла экспертызу нанесеных ёй пабояў і падала ў суд. Аднак Шулаў, мужчына моцнага целаскладу, былы міліцыянт, даводзіў, што яго самога збіла дзяўчына. Суддзя палічыла, што хуліганскія дзеянні дзяўчыны вагой 48 кілаграмаў у наяўнасці, і ўзяла бок адказчыка.

**• Шведскія феміністкі спалілі 100 тысяч крон.** Мяшок з грашыма гарэў каля 40 хвілін. «Гэта сума, якую жанчыны страчваюць штохвілінна ў выніку сэксуальнай дыскрымінацыі», — паведаміла лідэр партыі Гудрун Шуман. Яна прызнала, што гэтыя грошы маглі быць выдаткаваныя на дабрачыннасць, але Партыя феміністак — арганізацыя палітычная: «Мы не ахвяруем, мы спрабуем змяніць рэальнасць».

**• Гарэлка «Крышталь» прызнаная кашэрнай.** На просьбу кіраўніцтва завода «Мінск Крышталь» галоўны рабін Расіі выдаў сертыфікат кашэрнасці міжнароднага ўзору. Гэта дае магчымасць прадпрыемству экспартаваць прадукцыю на ўнутраны рынак Ізраіля. Прадукцыя кашэрная на ўсе дні году, акрамя дзён свята Песах.

**• Украіна афіцыйна стала бяз'ядзернай дзяржавай.** Вярхоўная рада заканадаўча зацвердзіла бяз'ядзерны статус краіны. На красавіцкім саміце па пытаннях ядзернай бяспекі ў Вашынгтоне прэзідэнт Віктар Януковіч заявіў, што Украіна за два гады пазбудзецца рэштак высокаўзгабачанага ўрану.

# Хлопец-беларус патануў у ЗША

22-гадовы беларускі хлопец Антон Жмачынскі 4 ліпеня загінуў у горадзе Ошэн Сіці (штат Нью-Джэрсі).

У Беларусі Антон навучаўся на гуманітарным факультэце БДУ па спецыяльнасці «Інфармацыйныя тэхналогіі». Сёлета перайшоў на пяты курс.

На тых летніх канікулах Жмачынскі ўпершыню выязджаў у ЗША на заробкі. Працаваў і ў кавярні, і ў гатэлі. Потым вярнуўся, каб працягнуць навучанне.

Гэтым летам зноў накіраваўся за акіян. У той вечар Антон пайшоў з сябрам на дзікі пляж і заплыў задалёка. Выратавальнікі не паспелі.

Родныя хлопца жывуць у Слуцку. Бацька з'яўляецца сябрам Партыі БНФ. Антон быў адзіным дзіцем у сям'і.

Пакуль невядома, калі цела даставяць у Беларусь.

**Зміцер Панкавец**



# Не ўсё ў жыцці апошні раз

## Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам даставіць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Адрз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

## Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

## Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Алегу Р. з Валожынскага раёна.
Лявону Л., Г.К., А.Б. з Мінскага раёна.
М.А. з Магілёва.
Сяргею Р. з Бярозаўскага раёна.
Сяргею Т. з Лідскага раёна.
Г.З. з Слонімскага раёна.
Ніне А. з Гродзенскага раёна.
Мікалаю Р. з Рэчыцкага раёна.
Валерыю П. з Баранавіцкага раёна.
Д.Н. з Ліды.
Іне П., Леаніду Я. з Пухавіцкага раёна.

# Хросны бацька капітуляваў

Працяг са старонкі 1.

У адваротным выпадку не было б гэтай балбатні ў тэлевізары. Мытны кодэкс мы ратыфікавалі. Мы сёння ў той жа сістэме каардынат, што і яны».

Адносна крытыкі з боку прэзідэнта Мядзведзева на свой адрас Аляксандр Лукашэнка заявіў: «Відаць, загаварыўся чалавек, трэба супакоіцца і паглядзець на той свет, які вакол яго, і свет, у якім мы жывем».

Напярэдадні Аляксандр Лукашэнка разаслаў лісты буйным расійскім бізнэсоўцам і камуністам, дзе тлумачыў сваю пазіцыю што да беларуска-расійскіх адносін. Мядзведзеў жа параіў Лукашэнку не займацца спамам.

«Не хваліцеся, іх справа гаварыць: ім блінОў хочацца, ім кілбасы хочацца, масла, мусіць. Цяпер надышоў час гаварыць пра нейкія лісты. Гэта ж не падкідныя лісты — гэта адкрытыя простыя лісты. І я маю права як старшыня найвышэйшай дзяржрады саюзнай дзяржавы, пра якую так марылі расійцы і беларусы, казаць тое, што я лічу патрэбным. Мы не забараняем Мядзведзеву таксама казаць тое, што ён лічыць патрэбным. Ён і кажа, толькі гэта трэба рабіць прафесійна, з веданнем справы», — кажа на гэта А.Лукашэнка.

А 5 ліпеня пра стварэнне Мытнага саюза было заяўлена афіцыйна на саміце ў Астане. Скасавання мытаў на нафтапрадукты беларусы не дачакаліся. Віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў сцвярджае, што мыты будуць зняты пасля таго, як Беларусь падпіша ўвесь пакет дакументаў па стварэнні адзінай эканамічнай прасторы. Зрэшты, гэта адбудзецца на святога ніколі.

Падобна на тое, што Лукашэнку хутка зламалі. Збоку гэта выглядае сапраўднай капітуляцыяй. Ніводнай саступкі не ўдалося выбіць. Нават нізкія мыты на ўвоз аўтамабіляў захаваюцца толькі на год, як і меркавалася раней.

Апазіцыйныя палітыкі лічаць падпісанне Мытнага саюза сур'ёзнай паразай. «Тактычна ў Мытным саюзе могуць быць некаторыя перавагі. Але стратэгічна гэта наша параза. Мытны саюз будзе перашкодай у інтэграцыі Беларусі ў Еўрапейскі саюз», — лічыць лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч.

«Зрэшты, некалі мы думалі, што не зможам выйсці з дамовы аб саюзнай дзяржаве. Але яна аказалася звычайнай бурбалкай. Так адбываецца з усім, што робіцца няшчыра», — працягвае А.Мілінкевіч.

«Так званы Мытны саюз Беларусі, Расіі і Казахстана — гэта «магільная яма», эканамічная пастка, падрыхтаваная гэбоўскай Расіяй для задушэння Беларусі, бо эканамічнай патрэбы ў гэтакім саюзе няма», — мяркуе лідэр КХП-БНФ Зянон Пазняк.

Не застаўся Мытны саюз і па-за ўвагай замежжа. Выданне The New York Times лічыць, што ў кароткатэрміновай перспектыве расійская сельская гаспадарка можа пацярпець ад канкурэнцыі з беларускай, а расійскія сталеліцейныя заводы — ад канкурэнцыі з казахскімі. Але ў даўжэйшай перспектыве адкрытасць на канкурэнцыю дазволіць Расіі пазбыцца сваёй залежнасці ад экспарту прыродных рэсурсаў і ўзмацніць ролю Масквы як рэгіянальнага фінансавага і бізнэсовага цэнтру.

**Зміцер Панкавец**

**Валеры Казакоў: Трэба ісці ў Гаагу, а не вякаць на тэлеканалах**

Валеры Казакоў з'яўляецца адным з найбольш уплывовых беларусаў у Расіі. Ён чыноўнік, які працуе ў Адміністрацыі прэзідэнта Расіі, памочнік паўнамоцнага прадстаўніка прэзідэнта Расіі ў Сібірскай федэральнай акрузе. Сп.Казакоў згадзіўся адказаць на некалькі пытанняў адносна бягучых беларуска–расійскіх дачыненняў.

**«Наша Ніва»: Глядзелі «Хроснага бацьку» па НТВ? Якое ўражанне?**

**ВК:** Дык нічога новага гэтым фільмам не сказалі.

**«НН»: Дык афіцыйнаму Мінску не крыўдзіцца за гэта на Расію?**

**ВК:** Навошта? Каб там была праўда, а то... Калі ёсць канкрэтныя доказы ў справе зніклых, то трэба ісці ў Гаагу, а не вякаць на тэлеканалах. На жаль, зніклі людзі, але патрэбнае дасканалае расследаванне справаў. Дрэнна, канечне, што Дзіму [Завадскага — «НН»] не знайшлі... Фільм брудны не толькі для лідэра Беларусі, але і для Мядзведзева.

**«НН»: Чаму?**

**ВК:** Бо калі тэлеканал можа абразіць аднаго прэзідэнта, то можа і іншага. Уявіце, што падобны сюжэт з'явіўся пра Абаму ці некага іншага. Гэта недапушчальна. Палітыка — гэта вялікая гульня. Магчыма, як казаў адзін амерыканскі палітолаг, шахматная, але яна мусіць весціся па канкрэтных правілах.

**«НН»: А нейкі працяг гэтая інфармацыйная атака на Лукашэнку будзе мець?**

**ВК:** Думаю, не. І расійскае кіраўніцтва, калі спатрэбіцца, скажа, што не бачыла гэты фільм, нічога пра яго не чула. А НТВ — прыватны тэлеканал, які належыць «Газпрому».

**«НН»: Дык які Ваш прагноз?**

**ВК:** Я думаю, што ўсё ўляжацца цягам некалькіх тыдняў. І гэтая «паганка» забудзецца. Мудрасць беларускага і расійскага кіраўніцтва — яна ж не такая павярхоўная, як многім хацелася б.

# Камароўскі перамог

## Новы прэзідэнт Польшчы пра афіцыйны Мінск: «Размаўляць можна нават з д'яблам».

4 ліпеня ў Польшчы адбыўся другі тур датэрміновых прэзідэнцкіх выбараў.

У яго выйшлі Браніслаў Камароўскі («Грамадзянская платформа») і былы прэм'ер-міністр Яраслаў Качынскі («Права і справядлівасць»).

Паводле афіцыйных вынікаў выбарчай камісіі, перамог маршалак Сейму Браніслаў Камароўскі. Ён набраў 53%. За Яраслава Качынскага галасы аддалі 47% выбарцаў. Яўка склала крыху больш за 50%. Далёка не тыя 90%, якія абвяшчае ў Беларусі Лідзія Ярмошына.

Браніслаў Камароўскі ў сям'і — бацька пяцёх дзяцей, а ў палітыцы — ветэран антысавецкага падполля і памяркоўны кансерватар. Ягоны род паходзіць з «Крэсаў», таму ён мае пэўны сантымент да Беларусі.

Качынскі больш кансерватыўны ў пытаннях маралі, больш жорсткі ў барацьбе з карупцыяй і савецкай спадчынай і больш схільны да дзяржаўнага ўмяшання ў эканоміку.

Камароўскі рэпрэзентуе партыю, якая адстойвае інтарэсы прыватнага бізнэсу. Посткамуністы, аднак, таксама схіляліся да падтрымкі ягонай кандыдатуры. У пытаннях замежнай палітыкі Качынскі арыентаваўся на незалежніцтва пры захаванні цеснага партнёрства з ЗША, Камароўскі — на яснейшую еўраінтэграцыю.

«Беларусь — гэта вельмі цяжкая праблема, бо спрабавалі адну палітыку — прынесла яна невялікія вынікі, другую — таксама нязначныя. Патрэбны сінтэз абодвух метадаў, але ні ў якім разе нельга прымаць рашэнні, якія могуць стварыць уражанне, што цвёрдая пазіцыя беларускага боку ацэньваецца палякамі як эфектыўная форма ўціску», — казаў Качынскі перад выбарамі. Таксама ён прапаноўваў гаварыць пра Беларусь з Дзмітрыем Мядзведзевым.

Камароўскі рашуча з гэтым не пагадзіўся. «Але такой палітычнай ідэі яшчэ не было! Каб з Масквою размаўляць пра Беларусь! Я катэгарычна супраць! Гэта абсалютна супярэчыць польскім нацыянальным інтарэсам і не прынята ў міжнароднай палітыцы. Гэта тое самае, як бы беларусы пра польскія справы з Расіяй размаўлялі або з Берлінам. Гедройц у труне пераварочваецца, а маршал Юзаф Пілсудскі выцягвае шаблю і рушыць на бальшавіка. Як можна пра справы Беларусі, Літвы, Украіны хацець размаўляць з Масквой? Гэта адмаўленне польскай незалежніцкай палітыкі, польскай усходняй палітыкі. Я не згодны. Польшча мае ўсё больш уплыў на ўсходнюю палітыку Еўрасаюза і павінна рабіць так, каб Еўропа мацнейшым голасам прамаўляла ў кантактах з прэзідэнтам Лукашэнкам. Польшча павінна падтрымліваць не толькі польскія недзяржаўныя арганізацыі ў Беларусі, але і іншыя, бо з іх складаецца дэмакратычнае грамадства».

Відавочна, што Камароўскі будзе размаўляць з афіцыйным Мінскам. Ён лічыць, што «размаўляць можна нават з д'яблам». Гэта будзе дыялог саступак з абодвух бакоў.



**Браніслаў Камароўскі — бацька пяцёх дзяцей і ветэран антысавецкага падполля.**

**ЗП**

## З'езд Партыі БНФ прызнаны неправамоцным

### Міністэрства юстыцыі вынесла папярэджанне партыі.

Прычынай стаўся зварот у Мін'юст аднаго з былых сяброў партыі (Уладзіміра Малея з Маларыты).

Малей знайшоў шэраг парушэнняў статуту і заканадаўства падчас правядзення пазачарговага XIII з'езду арганізацыі. Напрыклад, што дэлегаты не вылучаліся рэгіянальнымі суполкамі, а фактычна былі прызначаныя.

Міністэрства юстыцыі вырашыла, што падчас вылучэння дэлегатаў на з'езд быў парушаны прынцып дэмакратызму. «Рэвізійная камісія Партыі БНФ справядліва прызнала неадпаведным статуту і заканадаўству РБ парадак вылучэння дэлегатаў з'езду», — адзначаецца ў заяве Мін'юста.

Міністэрства юстыцыі прызнала з'езд 29 мая нелегітымным. На тым з'ездзе прымалася рашэнне аб удзеле Партыі БНФ у прэзідэнцкіх выбарах. Кандыдатам ад партыі быў абраны Рыгор Кастусёў. Дарэчы, Кастусёў застаўся адзіным кандыдатам ад БНФ. Лявон Баршчэўскі больш не мае намеру балатавацца.

А сам Уладзімір Малей за парушэнне партыйнай дысцыпліны быў выключаны з шэрагаў арганізацыі падчас апошняга сойму.

**ЗП**

## Сцісла

• **Раманчуку будуць збіраць подпісы 2000 чалавек.** Такое рашэнне прыняла Палітрада АГП. Пастаўленая задача сабраць 120 тысяч подпісаў пры неабходных 100 тысячах. Гэта патрэбна з улікам таго, што частка подпісаў можа быць прызнаная несапраўднай.

• **На афіцыйным канцэрце да 3 ліпеня кпілі з «Газпрома».** Рэзідэнты беларускага «Камеды-клаб» прысвяцілі свой выступ на канцэрце менавіта гэтай падзеі. «Нам ведь блинов, пирогов от соседей не нужно. Дружбой у нас называется просто труба», — спявалі беларускія гумарысты.

• **ЗША застануцца адданымі духу дыялогу з Беларуссю, які прывядзе да супрацоўніцтва на карысць дзвюх краін.** Пра гэта заявіў часовы паверaны ў справах ЗША ў Беларусі Майкл Скэнлан 1 ліпеня на прыёме ў гонар Дня незалежнасці ЗША. У той жа час, амерыканцы маюць пакінуць рэзідэнцыю ў Раўбічах, якая два гады пустуе, пасля адклікання паслоў дзвюх краін для кансультацый.

• **Выбары ў снежні?** Дэпутаты просяць Лукашэнку прызначыць правядзенне пазачарговай сесіі палаты прадстаўнікоў на 7 верасня. Выбары парламентарамі будуць прызначаныя на снежань, студзень ці люты.

**СГ, ЗП**

# Польскі бізнэс не спяшаецца ў Беларусь

Банк, мэбля ды мяса — вось і ўсе цяперашнія польскія інвестыцыі.

Супольнае беларуска-польскае прадпрыемства па будаўніцтве Зэльвенскай вугальнай электрастанцыі можа быць створана ўжо ў гэтым месяцы. Кошт праекту ацэньваецца ў 2 мільярды даляраў. Якія яшчэ эканамічныя інтарэсы маюць палякі на тэрыторыі Беларусі?

Пра капітал краін-суседак, укладзены ў Беларусь, «НН» пачала пісаць у №22 за 16 чэрвеня. Тады ўвага была сканцэнтраваная на літоўцах. Цяпер прыйшоў час польскага бізнэсу. Капітал самага заможнага паляка Яна Кульчыка, укладзены ў тэлекамунікацыі, нерухомасць і энергетыку, ацэньваецца ў $4,5 мільярды. І ён не адзіны мільярдэр у краіне. Літоўцы такіх багацеяў не мелі ніколі. Тым не менш, у Беларусь прыбалты інвестуюць нашмат больш.

## Мільярдэры граюць па-буйному

Той самы Кульчык і збіраецца будаваць Зэльвенскую электрастанцыю. Польская інвестыцыйная кампанія Kulczyk Investments, якая належыць яму, ужо абгаварыла з беларускім «Белэнерга» пытанні, датычныя будаўніцтва, а таксама тарыфнай і экспартнай палітыкі прадпрыемства.

Ідэя супрацоўніцва ўпершыню была агучаная яшчэ два гады таму падчас інвестыцыйнага форума ў Лондане, дзе, дарэчы, і жыве багаты паляк. З таго часу Ян Кульчык — адзін з любімых кампаньёнаў беларускага ўрада. Нездарма менавіта яго кампанія атрымала пасведчанне №1 інвестыцыйнага агента ўрада Беларусі.

З ідэй Кульчыка, звязаных з нашай краінай, можна ўзгадаць такую ж, як у Зэльве, вугальную станцыю ў Лельчыцах. Прыглядаўся мільярдэр і да «Беларусбанка». Праўда, ніводзін з праектаў пакуль так і не рэалізаваны.

Кульчык працуе не толькі ў нашай краіне, але і ў суседніх. Польскі алігарх хоча выкупіць газанафтавыя і энергетычныя прадпрыемствы Украіны.

Яшчэ адзін мільярдэр, Лешак Чарнецкі, валодае «Сомбелбанкам». У пачатку 2008 холдынг Getin Holding польскага багацея набыў 75,04% акцый банка. За іх Чарнецкі заплаціў амаль $6 мільёнаў.



Ян Кульчык — самы багаты чалавек Польшчы — мае намер збудаваць у Беларусі вугальную электрастанцыю.

## Брэст — польская мэблевая сталіца

Калі цэнтрам літоўскіх інвестыцый з'яўляецца Ліда, то польскія грошы перадусім цякуць у Брэст. Большасць невялікіх супольных прадпрыемстваў сканцэнтраваныя ў тутэйшай свабоднай эканамічнай зоне. Для параўнання, з 560 сумесных альбо выключна польскіх прадпрыемстваў, зарэгістраваных у Беларусі, на долю Брэстчыны прыпадае амаль палова — 43%. Нявызначаны статус свабодных эканамічных зон у наваствораным Мытным саюзе дадае трывогі польскім бізнэсоўцам. Ільготы — галоўнае, што прывяло іх у Беларусь.

«Белдрэў», «Мебелюкс-Брэст», «Еўрафорэст», «Блэк Рэд Уайт», «Анрэкс», «Мэбля-Нёман».... — вось некалькі з мноства сумесных кампаній, якія спецыялізуюцца на продажы драўніны ці мэблі.

З перспектываў міждзяржаўнага супрацоўніцтва вылучаецца праект польскай групы Atlas. Яна ўжо купіла актывы гродзенскай кампаніі «Тайфун» — вытворцы клеяў, тынкоўкі і сістэм ацяпленя. Кошт угоды ацэньваўся ў $4 мільёны. Цяпер палякі з Лодзі гатовыя адкрыць яшчэ адну вытворчасць на тэрыторыі Беларусі — новы завод па вырабе штучнага гіпсу. Ён, у сваю чаргу, будзе каштаваць каля 200 мільёнаў еўра.

## Польская Афрыка

Адно з экзатычных месцаў Кобрыншчыны — страўсавая ферма ля райцэнтра. Сумеснае беларуска-польскае прадпрыемства «ПМ і Кампанія», створанае ў 2002 годзе, займаецца развядзеннем афрыканскіх жывёлаў. На тэрыторыі ў 350 гектараў жыве каля 500 страўсаў.

Мясам, толькі ў больш традыцыйнай форме, займаюцца палякі ў Маладзечне. Мясцовы мясакамбінат «Мроз» названы ў гонар уласніка, польскага бізнэсоўцы Войцеха Мроза.

Увогуле, мяса, разам з мэбляй, — другі прыярытэт палякаў у Беларусі. Самы вядомы брэнд — брэсцкі «Інкафуд», створаны яшчэ ў 2001 годзе. Тады заходнікі пабудавалі завод з нуля. На тэрыторыю цяперашняга камбіната нават не былі праведзеныя камунікацыі.

Кандытарскімі вырабамі займаецца «Першая шакаладная кампанія». Тыя, хто нічога не чуў пра назву кампаніі, хаця б чуў пра брэнд шакаладу «Ідэал», які выбляецца прадпрыемствам.

Відавочна, што з увядзеннем бязвізавага рэжыму з Польшчай і Літвой колькасць дробных прадпрыемстваў з удзелам замежнага капіталу павялічыцца. А вось буйны бізнэс усё яшчэ глядзіць на Беларусь з пэўнай асцярогай. Цалкам імаверна, што шматмільярдныя інвестыцыйныя праекты Яна Кульчыка, у выпадку іх паспяховай рэалізацыі, адкрыюць дарогу буйным інвестарам.

**Яўген Васількоў**

**Перспектывы**

Дзяржаўная польская кампанія PZU прапанавала беларускім уладам куплю «Белдзяржстраха» ў выпадку яго акцыянавання. «Бедзяржстрах» трымае больш за палову (57%) страхавога рынку краіны.

| Інвестыцыі Польшчы ў Беларусь, $ млн | |
|---|---|
| 2009 | 22 |
| 2008 | 22 |
| 2007 | 27 |
| 2006 | 61 |

Крыніца: Белстат

# Мыты на аўто пратрымаюцца яшчэ як мінімум год

Такое рашэнне замацавана ў працаколе аб часовых выключэннях з працы супольнай мытнай тэрыторыі, падпісаным у Астане Беларуссю, Расіяй і Казахстанам.

Мыты будуць рэгулявацца нацыянальным заканадаўствам яшчэ год.

А вось мыты на нафту і нафтапрадукты будуць знятыя для Беларусі пасля падпісання і ратыфікацыі з яе боку ўсяго пакета дакументаў па стварэнні адзінай эканамічнай прасторы. «Беларускі бок па-ранейшаму лічыць, што фармаванне мытнага саюза вядзе да скасавання экспартных мытаў ва ўзаемным гандлі. Расія і Казахстан лічаць, што да фармавання адзінай эканамічнай прасторы ў кожнага боку застаецца права збіраць экспартныя мыты. Пасля фармавання такіх магчымасцяў не застанецца, — заявіў першы віцэ-прэм'ер урада Расіі Ігар Шувалаў.

Раней Беларусь прапанавала Расіі скасаваць мыты на нафтапрадукты ў 2010 годзе, а на нафту — з 1 студзеня 2011.

**БелаПАН**

# Сяргей Чалы: «Да пачатку восені еўра дасягне 1,37—1,39 даляра»

Знаны сваімі трапнымі прагнозамі эканаміст аптымістычна глядзіць на перспектывы еўрапейскай валюты.

Незалежны эканаміст Сяргей Чалы штомесяц публікуе прагноз паводзінаў еўра і даляра на найбліжэйшы час. Летась ён дакладна прадказаў падзенне еўрапейскай валюты да крытычнага шматгадовага мінімума. Цяпер, у новым прагнозе, ён пераконвае — еўра не здасца.

Паводле ягоных падлікаў, да 15 ліпеня еўра дасягне ўзроўню 1,31—1,32 у адносінах да даляра. Далей адбудзецца трохтыднёвае павольнае падзенне да 1,30 і, нарэшце, рэзкі ўздым да 1,37—1,39. Пік еўра, на думку эканаміста, «прымеркаваны» на сярэдзіну—канец жніўня.

На дадзены момант еўра роўнае 1,25 даляра за кошт уздыму на мінулым тыдні. Па курсе Нацбанка, кошт даляра складае 3015 рублёў, а еўра — 3780 рублёў. Дарэчы, адразу пасля дэвальвацыі беларускай валюты ў пачатку 2009 курс еўрапейскай валюты быў усталяваны падобным да цяперашняга — 3700 рублёў.

**ЯВ**

# За $7 млрд «бясплатных грошай»

урад разлічвае прадаць акцыі «Беларуськалія».

У той жа час Саўмін хоча захаваць кантроль над прадпрыемствам.

«Мы нікому ніколі кантрольны або блакавальны пакет не аддамо, — заявіў першы віцэ-прэм'ер Беларусі Уладзімір Сямашка. — Але краіне патрэбныя грошы, грошы бясплатныя, не крэдыты, нават пад 2—3%, бо гэта ўсё роўна крэдыты, якія трэба вяртаць».

У выпадку продажу пакета акцый «Беларуськалія» размова ідзе пра рэалізацыю часткі ўласнасці. Па такой самай схеме Беларусь у свой час прадала «Белтрансгаз» расійцам за $2,5 мільярды.

У выпадку «Беларуськалія» ўрад разлічвае на зацікаўленасць Кітая, аднаго з галоўных спажыўцоў беларускіх угнаенняў.

**ЯВ**

## Сцісла

• **МВФ і Украіна дамовіліся пра крэдыт на $14,9 мільярда.** Крэдыт стэнд-бай будзе выдадзены цягам 2,5 гадоў. У якасці ўмовы для яго выдачы Украіна заканадаўча правядзе рэформы ў бюджэтнай, фінансавай і энергетычнай сферах.

• **Чарніцы будуць пастаўляць у Італію і Кітай.** Белкаапсаюз праводзіць перамовы аб экспарце чарніц у замежныя краіны. За студзень-май 2010 на экспарт было пастаўлена прадукцыі на $18,4 мільёна.

• **Немцы інвестуюць у беларускія ветракі 360 мільёнаў еўра.** Нямецкая кампанія Enertrag AG і Мінаблвыканкам падпісалі інвестыцыйную дамову наконт будаўніцтва ў Дзяржынскім раёне сучаснага ветрапарка. Тут будзе выракляцца каля 170 мільёнаў кілават/г электраэнергіі — гэта прыкладна гадавое забяспечанне двух такіх раёнаў, як Дзяржынскі.

• **Беларусь пагасіла дзяржаўны крэдыт, які быў узяты ў Азербайджана на 12 дзён.** Для пагашэння доўгу перад «Газпромам» за газ, выстаўленага ў студзені-красавіку гэтага году, быў узяты дзяржаўны крэдыт у Азербайджана на $200 мільёнаў. З гэтай сумы быў зроблены плацёж на адрас «Газпрома» ў памеры $187 мільёнаў.

• **Абама вылучае $2 млрд на развіццё геліяэнергетыкі.** Дзяржаўны крэдыт атрымаюць дзве кампаніі, якія працуюць у сферы вытворчасці сонечнай энергіі. Abengoa Solar Inc і Abound Solar Manufacturing спадзяюцца з дапамогай атрыманага крэдыту развіць сваю вытворчасць.

**ЯВ**

# Латушка спыніў «цыбульную рэканструкцыю» ў Навагрудку



**Мінкульт мае дапрацаваць праект рэстаўрацыі гатычнай Барысаглебскай царквы.**

Працы ў Барысаглебскай царкве ў Навагрудку спыненыя. Нагадаем, у выніку рэканструкцыі на вежах унікальнай гатычнай царквы маглі з'явіцца пазалочаныя цыбулепадобныя купалы (пра гэта «НН» пісала ў №24 ад 30 чэрвеня). Такая «рэстаўрацыя», што ішла з ініцыятывы мясцовага святара, абурыла грамадскасць. Таварыства аховы помнікаў узняло трывогу ў СМІ.

Шэраг інтэлектуалаў — філосафы Алесь Анціпенка і Валянцін Акудовіч, архітэктар Ірына Лаўроўская, мастацтвазнаўцы Сяргей Харэўскі і Максім Жбанкоў — звярнуўся ў Беларускі Экзархат РПЦ і Міністэрства культуры з просьбай не дапусціць варварства з царквой у Навагрудку.

Інтэрнэт-форумы СМІ, што апублікавалі інфармацыю пра рэканструкцыю, кіпелі абурэннем.

30 чэрвеня на сітуацыю адрэагавала Міністэрства культуры. У Навагрудскі райвыканкам было накіраванае прадпісанне спыніць працы, зацвердзіць у вызначаным парадку праектную дакументацыю і атрымаць дазвол Мінкульта на працы. У Мінск выклікалі загадчыка аддзела культуры райвыканкама Аляксандра Карачана і святара Мікалая Орсу. І ў райвыканкаме, і ў прыходзе раней заяўлялі, што неабходныя дакументы і дазвол былі атрыманыя.

### Ігар Чарняўскі: Занадта шмат эмоцый

Начальнік Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Мінкультуры патлумачыў «НН», што ягонае ведамства падрыхтавала прадпісанне па вядзенні рэстаўрацыйных прац у Навагрудку, копію якога накіравалі ў Навагрудскі райвыканкам. Ён не ўдакладніў дэталі прадпісання, адзначыўшы, што цяпер вядзецца падрыхтоўка неабходнай нарматыўнай дакументацыі. «А ці будуць тыя цыбуліны, ці не будуць, стане ясна пасля канчатковай падрыхтоўкі праекту».

«Кажуць, што царква тая гатычная. Так, там ёсць магутны пласт готыкі. Але былі ж і пазнейшыя перабудовы, змены», — адзначыў чыноўнік. Ён заўважыў, што вакол навагрудскай царквы «занадта шмат эмоцый»: «Ёсць нацыянальнае заканадаўства, ёсць еўрапейскае, вось і трэба трымацца законаў, а не эмоцый».

### «Цыбуліны» каштоўнасці не маюць

Навагрудскі святар казаў, што з усталяваннем цыбулепадобных купалоў царква якраз набудзе «гістарычны» выгляд, які яна мела пасля рэканструкцыі ў XIX ст. Чым маюць кіравацца рэстаўратары, калі храм цягам сваёй гісторыі кардынальна перарабляўся? На гэтае пытанне адказаў на форуме nn.by архітэктар-рэстаўратар Уладзімір Папруга.

«У рэстаўрацыі ёсць паняцце «пазнейшых напластаванняў», да якіх трэба ставіцца гранічна ўважліва ды максімальна шанаваць, калі яны не перашкаджаюць успрыняццю найважнейшых аўтэнтычных асаблівасцяў помніка ды не ўваходзяць у супярэчнасць з імі», — піша ён. У.Папруга падкрэслівае, што «асабліва гэтае палажэнне актуальнае для аб'ектаў «рэстаўрацыйнага памежжа» — то бок тых, аўтэнтычнае аблічча якіх змянялі яшчэ да прыняцця міжнароднай супольнасцю Венецыянскай хартыі. У той хартыі, што пачала ствараціца ў канцы XVIII ст. і была зацверджаная ў 1964 г., дасканала прапісаныя нормы рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры.

Расійская ж Праваслаўная Царква цягам XIX ст. вешала на беларускія культавыя аб'екты свае «цыбуліны», каб абазначыць «кананічную» тэрыторыю. Таму ўся тая яе дзейнасць, паводле словаў архітэктара, таксама трапіла ў катэгорыю «рэстаўрацыйнага памежжа».

Прасцей кажучы, цыбулепадобныя купалы, напрыклад, на барочным храме ў Глыбокім, маюць такую ж гісторыка-архітэктурную каштоўнасць, якую мела б сучасная шкляная прыбудова да храма.

### Не падабаецца — пабудуй сваё

Жорстка раскрытыкаваў сп.Папруга і навуковага кіраўніка рэстаўрацыі Барысаглебскай царквы — дацэнта кафедры тэорыі і гісторыі архітэктуры БНТУ Генадзя Лаўрэцкага. Паводле словаў Папругі, Лаўрэцкі «неабгрунтавана дазваляе сабе адвольную «рэстаўрацыю», ігнаруючы галоўныя прынцып: рэстаўрацыя помніка сканчаецца там, дзе пачынаецца здагадка. Ніякім чынам прафесійныя пытанні рэстаўрацыі не вызначаюцца замоўнікам, бо гэта адразу спывае ў кіч, з бязлітасным разбурэннем самога помніка. Гэта і амаральна, і незаконна».

«Ні святар, ні прыхаджане не маюць права нявечыць аўтэнтычныя помнікі, — піша У.Папруга. — Калі яны не могуць увайсці ў культурны кампраміс з аўтэнтыкай помніка гісторыі — яны павінны пакінуць яго ў спакоі ды збудаваць, хай і побач, але свой, на іх погляд «правільны» і «лепшы». Яны абралі іншы, цалкам амаральны і незаконны шлях. І ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам павінны адмовіцца ад сваіх антызаконных дзеянняў. А Міністэрства культуры — уважліва прасачыць, каб помніку не было нанесена шкоды ад запланаванай уласнікам інтэрвенцыі».

### «Вытрымаць культурны баланс»

Галоўная задача рэстаўрацыі, піша У.Папруга, — вытрымаць культурны баланс. Гэта высокапрафесійная задача многіх спецыялістаў. У гэтым працэсе няма места палітыканству, густаўшчыне і адміністрацыйнаму ціску, замоўцы ў тым ліку. Інакш помнікі безнадзейна страчваюцца. Гістарычны цэнтр Мінска — самы блізкі і красамоўны прыклад.

**Сямён Печанко**

## У Лідзе з'явіцца бульвар Гедыміна і вуліца Грунвальдская

Як падкрэсліў у сваім інтэрв'ю Лідскаму тэлебачанню Антон Глаўніцкі, намеснік старшыні Лідскага выканкама, перайменаванне чатырох вуліц адбываецца ў выніку зваротаў у мясцовыя органы ўлады грамадзян, грамадскіх арганізацыяў і партый. Прапанова аб перайменаванні ўжо ўзгодненая з Міністэрствам культуры і аблвыканкамам.

З 1 жніўня ў Лідзе пачнуць мяняць шыльды, каб жыхары і госці горада маглі прагуляцца па Замкавай ці бульвары Гедыміна.

Вуліца Грунвальдская з'явіцца на ўчастку вуліцы Энгельса, ад Савецкай ля фарнага касцёла да перасячэння з вуліцай Радзюка каля старых каталіцкіх могілак.

Вуліца Замкавая зменіць сваё размяшчэнне. Дамы адной з самых старых вуліцаў — Замкавай — зносяць, і вуліца фактычна знікае, каб вызваліць месца для новага возера. Новая прапанова мясцовых уладаў — перайменаваць у Замкавую вуліцу частку вуліцы Камсамольскай ад фарнага касцёла, які на вуліцы Савецкай, да вуліцы Перамогі.

Пешаходная вуліца ад аўтавакзала да замка, якую ў народзе называюць бульварам Чапаева, прапанавана назваць бульварам князя Гедыміна.

Таксама ў горадзе з'явіцца праспект Перамогі. Новая дарога, якая будуецца за замкам, з'яднае вуліцу Перамогі і Энгельса. Ад перакрыжавання з вуліцай 8 Сакавіка да выхаду на Мінскую трасу і плануецца новы праспект.

**Настасся Шамрэй**

## Здарэнні сцісла

• **Зніклая мінчанка знойдзеная замураванай.** У вёсцы Старынкі Вілейскага раёна следчыя пад слоем зямлі і цэменту знайшлі цела зніклай 20-гадовай дзяўчыны. Рукі дзяўчыны былі звязаныя, у роце быў кляп. У забойстве падазраецца 24-гадовы ўнук мясцовай жыхаркі, у гаражы якой і знайшлі цела. Ахвяра працавала інструктарам па коннай яздзе ў фірме ў Старынках. Падазраваны, работнік адной з мінскіх СТА, абвешчаны ў вышук.

• **Інцыдэнт у Гомелі.** Падчас святкавання 3 ліпеня каля Лядовага палаца міліцыя заўважыла пакунак, пакінуты пад елкай. Адразу выклікалі сапёраў. Людзей пра магчымую небяспеку не папярэджвалі. Патруль проста папрасіў людзей адысці з землянога насыпу-клумбы. За 5—8 хвілін пакунак быў вынесены за межы тэрыторыі мерапрыемства.

• **Выкладчыца брала 60 тысяч рублёў за экзамен.** У Гомелі затрымалі педагога дарожна-будаўнічага каледжа. Жанчыну падазраюць у тым, што яна брала хабар з навучэнцаў за экзамены і курсавыя. У жанчыны знайшлі сшыткі з улікам прыбыткаў.

• **Махляры «прадавалі» будаўнічым арганізацыям няісную металапрадукцыю.** Хітруны арганізавалі фірму, якая прапаноўвала танную металапрадукцыю з умовай стопрацэнтнай передаплаты. Фірма была зарэгістраваная на пашпарт жыхара Мінскай вобласці. Дакумент лічыўся непрыдатным, а яго гаспадар пра тое, што з'яўляецца ўладальнікам фірмы, даведаўся толькі ад міліцыянераў. Шэсць будаўнічых арганізацый пералічылі на рахунак фірмы больш за 35 млн рублёў.

• **Аўтастоп з дапамогай камня.** 17-гадовы хлопец з сябрам вярталіся з вёскі Петкавічы Баранавіцкага раёна. Ісці пешшу надакучыла, і яны вырашылі спыніць грузавік. Пабачыўшы, што кіроўца ЗІЛа спыняцца не збіраецца, адзін з падлеткаў запусціў у лабавое шкло машыны камнем. На шчасце, кіроўца ад удару не пацярпеў. Распачатая крымінальная справа.

• **Пад Гроднам выяўленая плантацыя маку.** Паблізу вёскі Бакуны ў Гродзенскім раёне супрацоўнікі міліцыі і памежнікі выявілі 8 гектараў маку ў пагранічнай зоне.

• **Згарэла 450 тон сена.** Буйны пажар адбыўся на тэрыторыі сельгаспрадпрыемства «Ураджайны» ў Лоеўскім раёне Гомельскай вобласці. Вясной мясцовыя ўлады хацелі далучыць «Ураджайны» да суседняга прадпрыемства, але жыхары выказалі пратэст, і райвыканкам рашэнне адмяніў. Ёсць меркаванне, што падпаліць сена маглі працаўнікі самастойнай дзейнасці сельгаспрадпрыемства.

• **З бензапілой на следчага.** У Аршанскім раёне 41-гадовы нецвярозы рабочы пасварыўся з жонкай, выгнаў на вуліцу дзяцей. Жанчына выклікала міліцыю. Гаспадар узяў пілу ў рукі, завёў яе і стаў пагражаць людзям у форме. Супрацоўнік чатыры разы стрэліў уверх. Потым спатыкнуўся і ўпаў. Скандаліст занёс над ім бензапілу. Тады міліцыянт вымушаны быў стрэліць прыцэльна.

**СМ; БелаПАН, «Звязда», «Еўрарадыё»**



Луіс Суарэс.

# Новая рука Бога

**Рэдкі па драматызме матч падарылі на чэмпіянаце свету футбалісты зборных Уругвая і Ганы.**

Зрэшты, глядзець увесь матч было зусім не абавязкова. Дастаткова было зірнуць апошнія хвіліны дадатковага часу. Асноўны скончыўся ўнічыю — 1:1.

Афрыканцы вялізнымі намаганнямі рынуліся на апошні штурм варот уругвайцаў. Мяч замітусіўся ў штрафной. Уругвайцы ніяк не маглі выбіць прадмет гульні, нібыта яго магнітам цягнула да ганцаў.

З першай пагрозай спраўляецца брамнік. Апія дабівае, але на самай стужцы галкіпера падстрахоўвае палявы гулец. Яшчэ адзін удар ва ўпор! Брамнік Муслера бяссільны, затое мяч з варот рукой выбівае нападнік Луіс Суарэс.

Суддзя, натуральна, выдаляе футбаліста, Суарэс у слязах пакідае поле. А ў вароты Уругвая прызначаецца пенальці. Гана была за крок ад гістарычнага выхаду афрыканскай каманды ў паўфінал мундыялю.

Азамоа Г’ян, які ўжо рэалізаваў на першынстве два адзінаццаціметровых, няспешна ўсталёўвае мяч. Суарэс, сыходзячы ў падтрыбуннае памяшканне, азіраецца, каб пабачыць гэты ўдар. Г’ян б’е ў папярэчыну!

Слёзы на твары Суарэса імгненна высыхаюць. У серыі пенальці ўжо ўругвайцы маюць псіхалагічную перавагу. Яны яе не ўпускаюць.

Шчаслівейшага чалавека за форварда нідэрландскага «Аякса» Луіса Суарэса ў той вечар не было. Затое чарга сыходзіць залітым слязьмі прыйшла Г’яну.

«Я павінен быў захаваць шанцы на ўдзел нашай каманды на чэмпіянаце. Мы маглі прайграць, але нас выратавала рука Бога, якая цяпер належыць мне», — кажа Суарэс.

Выраз пра «руку Бога» належыць аргенцінцу Дыега Марадоне, які забіў рукой гол у вароты англічан на мундыялі ў 1986 годзе.

Брамнік зборнай Нідэрландаў і аднаклубнік Суарэса Марцен Стэкельбург так пажартаваў з калегі: «Я напісаў яму смс, што Суарэс — найлепшы брамнік першынства. Я сапраўды думаю, што менавіта Суарэс павінен атрымаць прыз імя Льва Яшына».

«Я хутка прыйшоў у сябе, у мяне ўстойлівая псіхіка, — кажа Азамоа Г’ян. — Што датычыць Суарэса, то ён, безумоўна, герой сваёй краіны».

### Першыя дазволілі гуляць чорным

Зборная Уругвая, бясспрэчна, — галоўная сенсацыя першынства. Выхад у паўфіналы іншых зборных спрагназаваць было можна, а вось з Уругваем мала хто адгадаў.

Мо мала хто ведае, але Уругвай — самая тытулаваная зборная XX стагоддзя. «Урусы», як называюць каманду з гэтай краіны, паспелі выйграць два чэмпіянаты свету і чатырнаццаць Кубкаў Амерыкі.

Як і па ўсім свеце, гульню ва Уругвай завезлі брытанскія мігранты ў 1880-х гадах. Дзесьці да гэтай новай гульні прыглядаліся з насцярожанасцю, але Паўднёвай Амерыцы гульня прыйшлася яўна даспадобы.

Той час якраз супаў з актыўным эканамічным ростам Уругвая. Краіна ўмацоўвала сваю стабільнасць пасля вайны з Парагваем.

16 мая 1901 адбылася таварыская сустрэча паміж зборнымі Уругвая і Аргенціны. Апошнія ў ёй перамаглі 3:2. Што цікава, тая гульня афіцыйна лічыцца першай на ўзроўні нацыянальных каманд, якая была згуляная за межамі Вялікабрытаніі.

У 1916 годзе ў Аргенціне адбыўся першы Кубак Амерыкі, дзе апроч гаспадароў і Уругвая ўдзельнічалі Бразілія і Чылі. Уругвайцам дастаўся той тытул. Дарэчы, зборная гэтай краіны вылучалася і дэмакратызмам. За «урусаў» гулялі негры — Ісабеліна Градзін і Хуан Дэльгада.

### Справа гонару

Бліскучая гульня Градзіна ў свой час стала першым сігналам у барацьбе з расізмам, што панаваў у паўднёваамерыканскім спорце ў пачатку стагоддзя. Прыклад Уругвая спачатку натхніў Чылі дазволіць чарнаскурым выступаць за зборную, а потым — і астатнія краіны кантынента.

У 1924 і 1928 гадах уругвайцы не пакідалі супернікам ніякіх шанцаў на Алімпіядах. Месцам правядзення першага чэмпіянату свету ў 1930 годзе была абраная сталіца Уругвая — Мантэвідэа (краіна ў той год адзначала стагоддзе незалежнасці).

Гаспадары па праве выйгралі той турнір. Ні разу не даўшы засумнявацца ў сваёй сіле. Наступныя два мундыялі «урусы» прапускалі ў знак пратэсту, што моцныя еўрапейскія зборныя праігнаравалі спаборніцтвы ў іхнай краіне.

Другое з’яўленне ўругвайцаў на чэмпіянаце свету датуецца 1950 годам. І тады яны таксама сенсацыйна сталі чэмпіёнамі, перагуляўшы ў фінале Бразілію.

### Цяжкі адбітак дыктатуры

Яшчэ ў 1970 годзе ўругвайцы змаглі дайсці да паўфіналу, але гэта было апошняе іх буйное дасягненне на чэмпіянатах. Зборная рэзка пайшла ўніз.

Магчыма, звязана гэта і з палітычным становішчам у краіне. У 1970-я ўладу ва Уругваі захапілі вайскоўцы. Кіраўнікі мяняліся часам па некалькі разоў на год. Асабліва катастрафічным было кіраванне Хулiё Сангінеці, якое суправаджалася вялізным нарастаннем замежнага доўгу, а інфляцыя складала па 75% у год.

Сёння ва Уругваі зноў назіраецца палітычная і эканамічная стабільнасць. Уругвай — адна з найбольш развітых краін Лацінскай Амерыкі. Дарэчы, 9/10 тэрыторыі краіны займаюць сельскагаспадарчыя землі, у асноўным пашы. Аднак у сельскай гаспадарцы працуе толькі 9% жыхароў краіны.

Футбольныя поспехі вярнуліся за эканамічнымі.

**Зміцер Панкавец**

# Марадона начытаўся Шпенглера

**«Еўрапейскі футбол памірае. А вось паўднёваамерыканскі ідзе наперад», — сказаў перад чвэрцьфіналамі славуты аргенцінскі трэнер Дыега Марадона.**

Сапраўды, каманды з Амерыкі ў групавым этапе згубілі толькі Гандурас, а да чвэрцьфіналу дайшлі Аргенціна, Бразілія, Уругвай і Парагвай.

Але ў чацвёрку наймацнейшых выйшлі толькі ўругвайцы. А найбольш жорстка былі бітыя самі аргенцінцы. Нямецкая машына не пакінула ад амерыканцаў каменя на камені. Каманда Марадоны выглядала школьнікамі, якія выйшлі на гульню з майстрамі з вышэйшай лігі.

Усімі хвалёны Леанель Месі выглядаў усяго толькі футбалістам, які падае надзеі на фоне яшчэ маладзейшага за яго Мюлера. Немцы выйгралі з лікам 4:0. І гэты вынік цалкам адлюстроўвае сілы зборных. Фрау канцлерцы Меркель было чаго падскокваць ад радасці на трыбуне ў Кейптауне.

А Марадона, здаецца, проста начытаўся Оскара Шпенглера, які таксама прадказваў заняпад еўрапейскай цывілізацыі. Зарана хаваеце!

Нідэрландцы таксама не пасаромілі гонару старога кантынента, выйграўшы ў Бразіліі. Футбол у апошніх удаецца толькі калі яны выйграюць. Калі ж прапускаюць, то імгненна губляюць ніць гульні.

Так было і гэтым разам. Варта было Снайдэру двойчы адзначыцца, як у бразільцаў усё пасыпалася. Яны сталі нервавацца, адкрыта грубіць. Мела нават атрымаў чырвоную картку.

Моц бразільскага футбола — у экспрэсіі, яны не могуць быць такімі акадэмічнымі і правільнымі, як еўрапейцы. Дунга спрабаваў прышчапіць сваім суайчыннікам еўрапейскі футбол, але гэта скончылася фіяскам. Трэба спадзявацца, што наступны трэнер бразільцаў вернецца да традыцыйнага лацінаамерыканскага карнавалу.

А абсалютна сумную гульню Парагвай — Іспанія вырашыў выратаваць каларытны суддзя з Гватэмалы Карлас Батрэс. Ёсць суддзі, якія лічаць, што найлепшай ацэнкай працы з’яўляецца іх нябачнасць на полі. А ёсць такія, як Батрэс, якія хочуць быць галоўнай дзейнай асобай на стадыёне.

Іспанцы з парагвайцамі шчыра мучыліся, катаючы нулявую нічыю, пакуль за справу не ўзяўся гватэмалец. Спачатку ён прызначыў пенальці ў вароты іспанцаў — галкіпер адбіў. Літаральна праз хвіліну адзінаццаціметровы ставіцца ўжо ў процілеглыя вароты.

Алонса забівае. Але гэтага мала для драматургіі гульні. Батрэс заўважае, што іспанцы забягаюць у штрафную яшчэ да ўдару Алонса. Ён просіць перабіць. І з другім ударам галкіпер ужо спраўляецца. Два нерэалізаваныя пенальці!

Суддзя стаў галоўным персанажам гульні, пры гэтым не дапусціўшы памылак. Матч якраз-такі і запомніцца ягоным арбітражам, а не вымучаным голам іспанца Вільы.

Немцы станавіліся чэмпіёнамі свету тройчы, уругвайцы — два разы, Іспанія і Нідэрланды — ні разу. Усё самае цікавае яшчэ наперадзе.

**ЗП**



**Іспанскі сэкс-сімвал Давід Вілья (справа) з пяццю галамі ўзначальвае спіс бамбардзіраў першынства.**



**Томас Мюлер кладзе пачатак разгрому аргенцінцаў. Легендарны аднафамілец форварда Герд Мюлер кажа, што Томас падобны да яго ў маладосці. Уся Германія фанацее ад Мюлера.**

# Мытная пастка

**Мэта «саюза траіх» — падпарадкаванне і ўдушэнне беларускай эканомікі расійскім бокам. Піша Віталь Сіліцкі.**

Беларускія аналітыкі звярнулі мала ўвагі на подбіўку мытнага саюза Расіі, Беларусі і Казахстана. Навошта ён спатрэбіўся Расіі, калі, здавалася б, ужо быў мытны саюз з Беларуссю, а гандлю з Казахстанам нічога не замінала?

Тут усё проста. Мытная палітыка ў рамках саюза, вядома ж, не планавалася на раўнапраўнай трохбаковай аснове. Стыль паводзінаў Расіі ва ўсіх постсавецкіх утварэннях — «у сильного всегда бессильный виноват».

Дык вось, у рамках двухбаковых адносінаў Беларусь неяк магла адпірацца, а ўжо калі тры бакі — ствараецца большасць. Вядома ж — Расіі з Казахстанам, у якіх практычна аднатыпныя эканомікі і падобныя інтарэсы ў плане мытнага рэжыму.

То бок мэтай «хаўрусу трох» было выключна падпарадкаванне і ўдушэнне беларускай эканомікі расійскім бокам, а сам саюз і планаваўся, і ажыццяўляецца як інструмент эканамічнага і палітычнага шантажу Беларусі (і тут пытанні ўласнасці, кантролю над інфраструктурай і ўсё астатняе). Усё, нічога больш у гэтым хаўрусе няма. Больш, дарэчы, нічога і не трэба.

Але ж ёсць нейкія законы, нормы, дамовы, міжнародныя правілы. Ну вось, скажам, каб заключыць новы шлюб, трэба разарваць існы. А тут выходзіць, што «шлюб» з Беларуссю Расія разарвала ў аднабаковым парадку,



заявіўшы, што ад 5 ліпеня дзейнічае толькі саюз, падпісаны ў трохбаковым парадку. А як жа мытны хаўрус Беларусі і Расіі, які існуе ад 1995 году? Яго хтосьці дэнансаваў? Хоць нейкую працэдуру разводу прайшлі?

Ды дзе там. Выходзіць такая сітуацыя. У сям'і з двух партнёраў адзін партнёр прыводзіць каханку і заяўляе другому — або менаж а труа, або прэч з хаты! Вось менавіта ў такой сітуацыі прававога бясчынства апынулася сёння Беларусь.

Дарэчы, ёсць яшчэ адна дамова, пра якую цяпер ніхто не ўзгадвае, — дамова пра саюзную дзяржаву. Вядома, вочы б мае гэтай дзяржавы не бачылі, але з яе, перад тым як заключыць мытны хаўрус у трохбаковым фармаце, Расія таксама мусіла выйсці. Прычым рэферэндумам, як закладзена ў дамове.

У межах дамовы пра саюзную дзяржаву «создание единого экономического пространства и правовых основ общего рынка» аднесена да выключнай кампетэнцыі саюзнай дзяржавы — Расія не мае права вырашаць гэтыя пытанні аднаасобна, а тым больш у тандэме з трэцяй краінай.

Ну і нарэшце — артыкул 29.

«В Союзном государстве действует единое таможенное пространство, в отношении которого применяются:

• единый порядок экспортного контроля;

• единые меры нетарифного регулирования, включая применение количественных ограничений, лицензирование ввоза и вывоза товаров, ведение единого перечня товаров, к которым применяются запреты или ограничения ввоза и вывоза;

• единый порядок взаимного признания лицензий, сертификатов и разрешений на ввоз или вывоз товаров».

Згодна з гэтым артыкулам, чыста фармальна кіраўнік Беларусі мае рацыю, патрабуючы адзінага парадку цэнаўтварэння на нафту. Іншая справа, што «з ваўкамі жыць — паваўчынаму выць». Самі ведалі, куды лезлі, і варыянтаў для адступлення не пакінулі — рынкаў, акрамя расійскага, у прамысловага хламу няма, а адносіны з Захадам умудрыліся ізноў ушчэнт сапсаваць. Званочкі, якія прагучалі яшчэ тры гады таму, так і не былі ўспрынятыя ўсур'ёз.

Нам жа засталося назіраць за фіналам сагі пра мытны хаўрус, у якой мог быць толькі адзін канец — дазволіць сабе не падпісаць саюза беларускае кіраўніцтва не магло.

Платай за няздольнасць забяспечыць дзейсную інфраструктуру незалежнасці краіны, у першую чаргу — знізіць спажыванне расійскай энергіі і падвысіць канкурэнтаздольнасць эканомікі, стала палітычнае згвалтаванне, праз якое прайшла беларуская эліта гэтымі днямі (на тле як быццам бы гераічнага супраціву ў газавых войнах гэты ціхі акт капітуляцыі выглядаў тым прыкрэйшым і агіднейшым). Застаецца толькі рабіць высновы, прычым не толькі беларусам, але і іх суседзям. Галоўная з якіх: усе дамовы, заключаныя з сённяшняй Расіяй і яе апантаным маніяй велічы кіраўніцтвам, могуць так і застацца фількінай граматай, калі Крэмль убачыць магчымасць дзейнічаць па праве моцнага. Хай задумаюцца энтузіясты разнастайных «патокаў».

**Belinstitute.eu**

**Віталь Сіліцкі**
доктар палітычных навук, дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (Вільня).

**Севярынец: Мытны саюз — найвялікшы геапалітычны правал апошніх гадоў**

Сустаршыня Беларускай хрысціянскай дэмакратыі Павал Севярынец выступіў з заявай адносна падпісання Беларуссю Мытнага саюза з Расіяй і Казахстанам.

«Мы расцэньваем падпісанне Мытнага саюза з Расіяй і Казахстанам як найвялікшы геапалітычны правал апошніх гадоў».

Эканамічная выгада ад такой «інтэграцыі», ды яшчэ і ўнутрана супярэчлівая на фоне пастаянных «гандлёвых войнаў», можа стаць для Беларусі катастрафічнай. Саюз з адсталымі ў эканамічным сэнсе і недэмакратычнымі рэжымамі — загадзя пройгрышны. Уступленне ў Сусветную гандлёвую арганізацыю «ўтраіх» — бязглуздзіца. Савецкая настальгія і жаданне застацца пры ўладзе любой цаной не могуць зрабіць з Лукашэнкі абаронцу нацыянальных інтарэсаў.

Часовыя выгады ад расійскага рынку збыту, адкуль нас пастаянна выціскаюць, несувымерныя са стратамі ад энергетычнай залежнасці і палітычнага расійскага дыктату.

Беларускім нацыянальным інтарэсам адпавядае найперш еўрапейская эканамічная інтэграцыя. Нам патрэбныя новыя тэхналогіі і заходнія інвестыцыі.

Нам трэба пераарыентавацца з энерга– і матэрыялаёмістай вытворчасці да праца– і навукаёмістай, а нас зноў «кормяць» пратухлымі савецкімі катлетамі папалам з мухамі», — сказаў Севярынец. Яго цытуе прэс–служба Беларускай хрысціянскай дэмакратыі.

# Праўда пра «Ману»

**Лявон Вольскі праспяваў песню з рэфрэнам: «Гавары праўду!»**

Песня Лявона Вольскага «Мана» пры канцы чэрвеня з'явілася на сайце грамадскай кампаніі «Гавары праўду». «Мана! Татальная мана! Мана! Татальная вайна! А ты кажы праўду, гавары праўду!» — спявае музыка.

Інтэрнэт адразу звінаваціў спевака ў кан'юнктурнасці.

Лявон Вольскі адказаў у сваім інтэрнэт-дзённіку: «Вось жа ж цікава! Уладзімір Пракопавіч [Някляеў] папрасіў музычна аздобіць верш «Мана». Я гэта зрабіў і аддаў спадару Някляеву. Даволі даўно. І паехала... Шаноўнае спадарства, я адказна заяўляю: рабіў бясплатна, без ганарару. Бо там пачалі ўжо казаць пра нейкія тысячы і дзясяткі тысячаў... Самае цікавае: калі адна сяброўка сказала ў офісе, што я зрабіў з верша песню бясплатна, ніводзін чалавек (!) не паверыў, — іранізуе Вольскі. — Якое-ніякое, а грамадства спажывання, спадарства! Кожны маркуе па сабе...»

Лявон Вольскі і N.R.M. у 2006 годзе былі запісалі песню «Гадзючнік», якая адразу стала гімнам Супраціўлення («Хай варожыць гадзючнік варожы, усё роўна мы пераможам!»).

У ЗША ці Вялікабрытаніі, з іх высокай палітычнай культурай дэмакратыі, публічная падтрымка



артыстамі палітыкаў лічыцца нармальнай з'явай.

Рэакцыя на песню Вольскага выкліканая найперш таямнічасцю, што ахутвае кампанію Някляева. Магчыма, спекуляцыі знікнуць, калі «Гавары праўду» канчаткова адкрые свае планы. Цяпер відавочна толькі тое, што «праўдзістам» удалося разварушыць млявае беларускае палітычнае поле і гэта шмат каму не падабаецца.

**Алесь Пілецкі**

МАНА

Век дваццаты за спіной,
Не збыліся нашы мары.
Мы атручаны маной.
Над табой і нада мной
Маны густыя хмары.

**Рэфрэн:**
Мана, татальная мана!
Мана, татальная вайна!
А ты кажы праўду, гавары праўду!

Праўда ў свеце ёсць адна,
Праўда нашага сумлення.
Ды татальная мана,
Як татальная вайна,
Ад якой няма збавення.

Рэфрэн

Праўда прыйдзе, як вясна,
І паўсюль зазелянее.
Сонца светлае — яна,
А сусветная мана — мумія ў маўзалеі.

# Іван Шыла пра «Гавары праўду»: Безідэйная кампанія

**Моладзевы лідэр Іван Шыла ў Фэйсбуку — пра грамадскую кампанію «Гавары праўду» і песню, напісаную для яе Лявонам Вольскім:**

Вольскі Вольскім. Што да «Гавары праўду», то не ўспрымаю нармальна безідэйную кампанію. Грошы, вядома, патрэбныя. Але, хаця б, крыху без іх. Дый людзі, якія там удзельнічаюць, абыякавыя да праўды, свабоды, сацыялізму, дэмакратыі, сумлення.

Наконт грошай «Гавары праўду» — не зайздрослна. Тыя людзі, якіх аб'яднала кампанія, разам не праз усведамленне жадання гаварыць праўду менавіта тут і цяпер. У Салігорску людзі мяняюць арганізацыі як пальчаткі і цяпер гавораць праўду. Бо не праўда ім патрэбна, а выключна грошы. І так у многіх гарадах, проста адпрацоўваюць грошы. Ідэя значэння зусім не мае.

Мяне не палохаюць трансферы актывістаў. Нягледзячы ні на што, кампанія задавальняе, бо дзейнасць лепш за бяздзейнасць. Проста выказваю меркаванне, што лепш бы дзейнасць была хоць крыху ідэйнай, а не толькі праплочанай.

Татальна плаціць грошы валанцёрам — гэта няправільна. Тады гэта ўжо не валанцёры і актывісты кампаніі, а наёмнікі, працоўныя на сезон. Не ведаю, як унутры, але некаторыя ўдзельнікі кампаніі наўрад усведамляюць сэнс механічных дзеянняў, якія агулам скіраваны на прасоўванне ўніверсальнай ідэі. Так падаецца звонку.

Дарэчы, не думаю, што «ГП» мае намер перамагчы Лукашэнку. А вось пасля выбараў грамадзянская кампанія, якая сваёй мэты (праўды ў краіне) не дасягне, знікне.

**Іван Шыла**
лідэр салігорскай моладзі. Яго забралі ў войска ў 2009. У выніку ўвагі, якую ён прыцягнуў да сваёй вайсковай часткі, там вырашаецца праблема ачысткі вады. Там таксама 15 чалавек прыцягнутыя да адказнасці за дзедаўшчыну (ва ўсёй астатняй Беларусі — 0). З войска Шылу камісавалі датэрмінова, знайшоўшы медычныя прычыны.

# НТВ прынізіла Лукашэнку

Працяг са старонкі 1.

Лукашэнка не расстаецца з малодшым сынам Колем. У пацверджанне гэтага мільгаюць кадры Лукашэнкі і Колі на вайсковых вучэннях, парадзе, выбарах, на будоўлі, падчас візіту да Папы. Кадры выяўляюць усю абсурднасць знаходжання маленькага хлопчыка на такіх мерапрыемствах.

Далей простым тэкстам гаворыцца, што мама Колі — «былая асабістая доктарка Лукашэнкі Ірына Абельская, якую ён потым зрабіў сваёй каханкай». «Каханне прайшло, і Ірына пазбавілася пасады. Колю Лукашэнка забраў сабе», — адзначаецца ў фільме. Падкрэсліваецца, што ўжо цяпер Аляксандр Рыгоравіч рыхтуе малодшага сына ў пераемнікі.

Расказваецца і пра іншых сыноў Лукашэнкі, якія займаюць высокія пасады. Гэта перакрыжоўваецца з кадрамі, на якіх Лукашэнка гаворыць, што «сям'і ў палітыцы рабіць няма чаго».

Далей з Лукашэнкі смяюцца. Расказваюць, што ён мае дыплом гісторыка і пры гэтым не ведае пра жыццё першадрукара Скарыны, а таксама пра вершы Быкава. Таксама расійцы пазычаюць кадры са стужак Юрыя Хашчавацкага «Звычайны прэзідэнт» і «Плошча».

«Сам сябе Лукашэнка любіць параўноўваць то з Гітлерам, то са Сталіным», — кажуць стваральнікі кіно. Далей ідзе запіс, на якім Лукашэнка захапляецца «фармаваннем прэзідэнцкай рэспублікі і ролі ў ёй прэзідэнта» ў Германіі часоў Гітлера. А літаральна праз імгненне — цытата, што ўсё гэта фальшыўка, якую зрабілі «апазіцыянеры з цурпнікамі ў Польшчы». «Калі б я такое сказаў пра Гітлера ў Беларусі, то мог бы быць ужо не прэзідэнтам».

Увогуле, у першай частцы шмат увагі надаецца менавіта выказванням беларускага лідэра, якія парушаюць нормы. Напрыклад, указанню прэм'еру Сідорскаму красці італьянскія лякалы.

Другая частка фільма прысвечаная гісторыі гучных знікненняў праціўнікаў Лукашэнкі. Жонка былога міністра Юрыя Захаранкі са слязьмі на вачах кажа, што забойства яе мужа замоўленае самім Лукашэнкам.

Нічога новага ў справе знікненняў беларускі глядач не пабачыць. Тое самае мы ўжо бачылі ў фільме Паўла Шарамета «Дзікае паляванне».

Успамінаецца, што амаль усе апазіцыянеры панюхалі нараў. Як прыклад, экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта Аляксандр Казулін. Кадры спробы Казуліна зарэгістравацца на «Усебеларускі сход» у 2006 і ягонае збіццё. У вызваленні Казуліна з турмы вызначальная роля прызнаецца за паслом Германіі Вайсам, які паабяцаў еўрапейскія крэдыты і нямецкія інвестыцыі.

Увогуле, Лукашэнка малюецца як хцівы, прагны да грошай чалавек. Менавіта дзеля расійскіх субсідый ён кляўся ў вечнай любові крамлёўскім кіраўнікам. «Крэдыты ў абмен на пацалункі». А як толькі замаячыла перспектыва атрымаць грошы еўрапейскія, то клятвы тыя забыў, не прызнаўшы незалежнасці Абхазіі і Асеціі.

Характэрны шэраг беларускіх палітыкаў, якіх выбралі для інтэрв'ю НТВшнікі, — Казулін, Ярашук, Лябедзька, Статкевіч. Паўлу Севярынцу ці Аляксандру Мілінкевічу слова не далі.

Статкевіч і Ярашук кажуць пра крах беларускай эканомікі, неканкурэнтаздольнасць яе без расійскай дапамогі. А дырэктар Інстытута краін СНД Затулін прадказвае «аранжавую» рэвалюцыю ў Беларусі.

«Лукашэнка стараецца спадабацца Еўропе, хоць сама Еўропа яму ніколі не падабалася. Ён спрабуе заслужыць давер Захаду цаной разрыву адносінаў з Расіяй», — падкрэслівае аўтар.

У канцы фільма зноў закранаецца праблема зніклых. Расійцы гэтым разам нават не спрабуюць рабіць з іх таямніцу, на іх думку, усё ў гэтых знікненнях абсалютна ясна. Даюць слова Алегу Алкаеву. А потым — слёзы Юры Завадскага і збіццё амапаўцамі ягонай мамы Святланы.

«Калі ты спрабуеш усіх падмануць, то ў канчатковым выніку падманеш самога сябе. Гэта відавочна, але ён гэтага не разумее. Цяпер настае момант ісціны, калі пачынаюць разумець і ў Еўропе, і ў Расіі. А самае галоўнае — гэта хутка пачнуць разумець і грамадзяне Беларусі», — фінальная цытата фільма належыць Аляксандру Казуліну.

Ясная справа, што ў Беларусі гэтае кіно не паказалі. Затое відэа хутка з'явілася ў інтэрнэце. Здаецца, што галоўнай мэтай, якой дабіваліся расійцы, — гэта прынізіць Лукашэнку, падарваць яго імідж як палітычнай фігуры.

Не верыцца, што такое кіно магло выйсці без дазволу найвышэйшага маскоўскага кіраўніцтва. Гэта яшчэ не чорная метка, але беларускаму лідэру намякаюць, што хутка ён можа дачакацца і яе.

**Зміцер Панкавец**

### Хто здымаў?

Аўтарам фільма «Хросны бацька» з'яўляецца Аляксей Малкоў. У жніўні летась ён разам з аператарам Юрыем Бабенкам быў высланы з Беларусі.

«Склалася ўражанне, што беларускія спецслужбы меркавалі, што ў Беларусь пад выглядам журналістаў прыехала нейкая спецгрупа для выканання спецзадання. Калі мяне «прабілі» па базе звестак і пераканаліся, што я сапраўды журналіст НТВ, на тварах мясцовых чэкістаў чыталася здзіўленне, змяшанае з расчараваннем, — сцвярджаў потым журналіст. — Далей нас даставілі ў Оршу, пасадзілі ў цягнік і адправілі дадому. Вядома ж, усе знятыя матэрыялы былі канфіскаваныя, таксама як і тэлефонныя SIM–карткі. Незразумела, навошта быў патрэбны ўвесь гэты спектакль, маглі забраць стужкі проста ў гатэльным нумары. Цяпер ужо я ведаю, якая рэальная сітуацыя ў Беларусі. Спецслужбы тут працуюць груба і нахабна».

Цікавае меркаванне пра Малкава мае Аляксей Венедыктаў з радыёстанцыі «Эхо Москвы»: «Тон, стылістыка. Я не хачу абмяркоўваць канал НТВ, але стылістыка праграмы «Максімум», умоўна кажучы. І нагадаю, што фільм пра Лукашэнку рабіў той самы чалавек, які расказваў пра тое, што Хадаркоўскі меў людзей забіваць. Пра тое, які нягоднік Гары Каспараў, які жыве за заходнія грошы. Гэта такі Мамантаў канала НТВ. Гэта такая стылістыка. Каб вы разумелі, Аляксей Малкаў, дарэчы, атрымаў ордэн з рук прэзідэнта Пуціна ў свой час».

Як бачым, фільм пра Лукашэнку здымаў прафесійны прапагандыст. Мы спрабавалі звязацца з Аляксеем, але той адмаўляецца ісці на кантакт з беларускімі журналістамі.



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

## БРСМ рэкламуе фільм «Хросны бацька» з дапамогай смецця

У аўторак на праспекце Незалежнасці ў Мінску актывісты БРСМ размясцілі на смеццевых баках прыпынкаў налепкі «Спецыяльна для НТВ!».

А каля ўваходу на Камароўскі рынак актывісты зладзілі перформанс «Асцярожна! Смярдзіць КАнаЛ НТВ!» Слова «кал» вылучалася на фоне слова «канал».

«У апошні час расійскі тэлеканал НТВ не перастае ліць бруд на нашу краіну, — напісаў сайт арганізацыі. — Цяпер аб'ектам смуроду рэпартажаў канала стаў кіраўнік беларускай дзяржавы».

Нечакана для БРСМаўцаў людзі старшых гадоў пачалі выказваць сваю салідарнасць з НТВ. Гэта адзіны канал, дзе праўду пачуеш, казалі яны. Людзі абвінавацілі БРСМаўцаў, што яны служаць Лукашэнку. БТ усё падманвае, казалі яны.

Іншыя ж людзі ахвотна бралі асвяжальнікі паветра і туалетную паперу, якія раздавалі БРСМаўцы.

Калі б аналагічны перформанс зладзілі праціўнікі Лукашэнкі, іх бы зараз жа завезлі ў каталажку. БРСМ жа пратэставаў супраць НТВ свабодна.

**Мікола Бугай**

# Бібліятэчка

Падборка найлепшых фільмаў і кніг пра кіраўніка Беларусі.

### Кіно

• **«Звычайны прэзідэнт».**

Рэжысёр — Юрый Хашчавацкі. Дакументальны фільм з адкрытай крытыкай Лукашэнкі з'явіўся ў канцы 1996. Стужка атрымала прызнанне за мяжой — узнагарода Берлінскага кінафестывалю, Прэмія Сахарава. У Беларусі фільм быў забаронены.

• **«Плошча».**

Знятая тым самым рэжысёрам у 2006 па матывах масавых акцый пратэсту апазіцыі, стала своеасаблівым працягам «Звычайнага прэзідэнта». Хашчавацкі аддаліўся ад асобы Лукашэнкі, але, тым не менш, не ўпусціў магчымасці ўступіць з кіраўніком дзяржавы ў завочны дыялог і нават паказаць у стужцы частку свайго першага фільма.

• **«Гудбай, бацька!».**




Пры стварэнні 25-хвіліннага фільма стваральнікі ўзялі за снову стужку «Гудбай, Ленін». Фабула — пасля перамогі апазіцыі малады чалавек спрабуе стварыць для свайго бацькі, прыхільніка Лукашэнкі, стабільную і квітнеючую Беларусь у асобна ўзятай кватэры.

• **«Дзікае паляванне» і «Дзікае паляванне — 2»**

— фільмы Паўла Шарамета, прысвечаныя знікненням людзей у Беларусі. Паказваліся ў эфіры Першага расійскага канала, але выразаліся беларускім АНТ і не трансляваліся на нашу краіну.

• **«МультЛичности».**

Расійскі серыял, у якім парадзіруюцца зоркі эстрады і палітыкі. У час газавага канфлікту асаблівая ўвага стваральнікаў была нададзеная менавіта асобе Аляксандра Лукашэнкі.



• **«Хросны бацька».**

Новы фільм тэлекампаніі НТВ у цыкле расследаванняў «Чыстасардэчнае прызнанне».

### Кнігі

• **«Выпадковы прэзідэнт», 2003.**




Аўтары — журналісты Павел Шарамет і Святлана Калінкіна — былі асабіста знаёмыя з Лукашэнкам яшчэ да яго прыходу да ўлады. Кніга, як пазначана ў анатацыі, — гэта «спроба раскрыць феномен Лукашэнкі і аддзяліць выдумку афіцыйнай прапаганды ад рэальных фактаў з жыцця беларускага прэзідэнта і яго асяродку». Другая частка выдання ўяўляе сабой падрабязны аповед Шарамета пра яго турэмнае зняволенне замест працягу біяграфіі Лукашэнкі. Продаж кнігі быў негалосна забаронены на тэрыторыі Беларусі.




• **«Лукашэнка. Палітычная біяграфія».**




Кніга выдадзеная ў Маскве ў 2005 журналістам Аляксандрам Фядутам, які ў 1994 працаваў у штабе Лукашэнкі, а ў 1995 сышоў з Адміністрацыі прэзідэнта. У творы — публіцыстычны аповед аўтара. Як і кніга Шарамета, у адкрыты продаж яна не паступіла.

• **«Нашэсце»**

Мастацкі твор, хоць аўтары і паспрабавалі надаць яму дакументальную форму. «Выбудоўваючы ўнікальны ланцуг з канкрэтных фактаў найноўшай беларускай

# Белоруссія невядомая

## Расійскія медыі пераадкрываюць для сябе Лукашэнку — а разам з ім і Беларусь.

«Не трэба рассылаць спам», — так грубавата адказаў Мядзведзеў на масавую рассылку лістоў, якую зладзіў Аляксандр Лукашэнка з мэтай паўплываць на думку расійскай эліты. Рэзкі тон прэзідэнта РФ зрабіўся сігналам для гарматнага залпу, які далі расійскія медыі па «малодшым брацiку». Найбольшы калібр меў разгромны фільм «Хросны бацька», паказаны па тэлеканале НТВ. Аднак і ў іншых публікацыях пракрамлёўскіх медыяў для Лукашэнкі прыемнага было мала. А вось маскоўскія лібералы, здаецца, яшчэ крышку — і пачнуць шкадаваць беларускага прэзідэнта.

### «Russia Today»: «У галаве Лукашэнкі нешта пераклініла»

«Russia Today» — англамоўны расійскі тэлеканал, створаны з мэтай навязваць (ці, як мінімум, пашыраць) у свеце пракрамлёўскія погляды. Гэтым разам, аднак, тэлеканал пазычыў штампы ў заходніх журналістаў: «На радзіме яго называюць «бацькам» — аднак за мяжой Аляксандр Лукашэнка вядомы як апошні еўрапейскі дыктатар». А вось далей зацягнулі ўжо чыста па-расійску: «Да апошняга часу адносіны паміж Масквой і Мінскам былі сяброўскімі. Аднак складаецца ўражанне, што ў галаве Лукашэнкі нешта пераклініла... І цяпер яго былыя саюзнікі — нумар адзін у спісе яго галоўных ворагаў».

Цікава, што тэлеканал даў слова Андрэю Саннікаву (называючы яго апазіцыйным лідэрам Беларусі). Ён сказаў: «Лукашэнка прывык гуляць у брудныя гульні, ён ніколі не выконвае сваіх абяцанняў — як Усходу, так і Захаду, і яму ўжо даўно ўсё сыходзіць з рук. Нічога новага ён не зрабіў. Ён проста не выконвае сваіх абавязкаў. Паглядзіце беларускае тэлебачанне — там на поўную моц ідзе антырасійская інфармацыйная вайна, Расію вінавацяць ва ўсім, што ідзе не так. З улікам адносін нашых краін такія войны весці проста непрымальна».

Вайна дык вайна — «Russia Today» працягвае дыванову бамбардзіроўку: «Адыёзны Лукашэнка трымае краіну ў жалезным кулаку. Знішчыўшы апазіцыю ўнутры краіны, ён у кастрычніку 2004 змяніў канстытуцыю і цяпер можа заставацца ля ўлады неабмежаваную колькасць прэзідэнцкіх тэрмінаў. Вясной 2006 пасля некалькіх месяцаў мітынгаў на вуліцы Мінска выйшла некалькі тысяч пратэстоўцаў. Лукашэнка паслаў на іх спецназ, які зрабіў сваю працу — жорстка задушыў пратэсты. Падобныя нахабныя дзеянні не маглі не нашкодзіць яго рэпутацыі».

З чаго б гэта «Russia Today» так затурбаваўся пра беларускую апазіцыю? Насамрэч за гэтым уяўным клопатам хаваецца вялікая геапалітычная крыўда: «Лукашэнка спадзяваўся на Расію на працягу апошніх 16 гадоў, з тых часоў як стаў першым — і пакуль адзіным прэзідэнтам краіны. Дэманстратыўнае ігнараванне найбліжэйшага суседа сваёй краіны — і наймацнейшага саюзніка — у многіх выклікае здзіўленне».

### «Камсамольская праўда»: хоць ты застрэлься

Расійскія медыі, відавочна, здагадваліся, што да масавага гледача ў Беларусі іх месідж не дойдзе. Усе фільмы пра Беларусь на расійскіх каналах унутры Беларусі перакрываюць іншымі перадачамі. Значыцца, асноўная аўдыторыя «накату» на Лукашэнку — расійскі чытач, слухач і глядач. Заўважыла гэта і «Камсамольская праўда» ў артыкуле «Кіно і Бацька», прысвечаным скандальнаму фільму на НТВ: «Шок ад «Хроснага бацькі» адбыўся ў першую чаргу ў Расеі, дзе раней у Лукашэнкі быў вобраз гэткага крыху нахабнага хітруна, які наягорвае расійскіх палітыкаў. Дый сіротаў і ўбогіх (Лукашэнка — аматар прыкінуцца бедным прэзідэнтам небагатай краіны) у Расіі шкадуюць і спачуваюць ім. Так, фільм для многіх расійцаў не проста стаў нагодай для расчаравання, але і прымусіў задумацца пра лёс Беларусі, якой кіруе такі «бацька».

«Фільм — жорсткі, Лукашэнка ў ім паказаны хітрым і нават жорсткім чалавекам, які фізічна распраўляецца са сваімі апанентамі. Пасля такіх сцэн альбо ідуць страляцца пад сцягам, альбо згараюць з сораму», — рэзюмуе журналіст «КП».

### «Эхо Москвы»: то «сукін сын», то «адзіны народ»

«Расійскія начальнікі загадалі падняць ім павекі, начальнікі паказалі пярстом у бок Мінска і страшным голасам сказалі: «Вось ён!» І адразу на прэзідэнта Лукашэнку рынулася НТВ, галоўны спецыяліст па разрыванні на часткі Ворагаў Расіі», — кажа вядучы ліберальнага радыё «Эхо Москвы» Сяргей Бунтман. У чым прычына гэтай атакі? «Расійская палітыка засвоіла адзін нескладаны закон дыпламатыі: «сукін сын, але наш сукін сын». Перастаў быць нашым — атрымай».

Здаецца, радыёкаментатар амаль гатовы пашкадаваць беларускага прэзідэнта: «Абрыд Лукашэнка? Ірвецца з кручка? Трэба своечасова падсекчы. Але надта ўжо сурова ды груба. Зрэшты, працуе! Выліўся з экрана цэбар рэалістычных памыяў, а назаўтра Аляксандр Рыгоравіч як міленькі падпісвае паперу пра Мытны саюз».

Аўтар робіць выснову: «Беларускаму прэзідэнту паказваюць, што ён з Расіяй у адной лодцы, і не простай, а падводнай, і хай ён не спрабуе парушыць яе герметычнасць».

А вось адказваючы на пытанні слухачоў перадачы «Асаблівае меркаванне», галоўны рэдактар «Эха Москвы» Аляксей Венедыктаў трапна выдаў настроі расійскіх лібералаў: «Чаму Лукашэнка нервуецца? Бо практычна Беларусь у многім жыве на датацыі РФ. Гэта праўда. Гэта лічбы. Чаму ён пайшоў зноў на Мытны саюз, і мусіў пайсці — таму што мы датуем гэтую эканоміку. І трэба разумець, што беларускія грамадзяне доўгія гады жылі на расійскія датацыі. На нашы з вамі падаткі. І калі ласка, я добра да гэтага стаўлюся, нічога страшнага, я лічу, мы адзін народ. Але гэта трэба разумець...»




### «Русский репортёр»: у пошуках загадкавай беларускай душы

Часопіс «Рускі рэпарцёр» адметны сваімі сакавітымі рэпартажамі, раскаваным стылем журналістыкі і вялікай колькасцю якасных фота. «Белоруссия сама по себе» — такую назву атрымалі падарожныя нататкі журналісткі «РР» Юліі Вішнявецкай, якая выправілася ў суседнюю краіну, каб разабрацца, што ж гэта за загадкавы край такі — «Белоруссия». Падарожжа журналістка пачала, дарэчы, з заходняга пункта — Гродна.

«Беларусь не можа не спадабацца — простымі формамі, пастэльнасцю, пустэчамі і прасторамі, нізкімі аблокамі і, галоўнае, амаль поўнай адсутнасцю дрэннага густу. Тут цяжка знайсці кіч, пачуць пафасную, фальшывую інтанацыю, тут увогуле ніхто не схільны кідацца ў скрайнасці». Рэдкім выпадкам, калі журналістка адчула фальш, быў... перадвыбарчы мітынг Франка Вячоркі ў Мазыры: «Дваццацідвухгадовы Франак — прыгажун, герой, інтэлектуал, апазіцыянер. І ён — у вайсковай форме. Зрэшты, апошні дзень: учора яго камісавалі па здароўі, бо Франак, па яго ўласным выразе, «усіх дастаў»... Мы заходзім у суседні пад'езд, грукаемся ў кватэру, старая, якую завуць баба Сеня, дазваляе працягнуць падаўжальнік з акна. З мікрафонам Франак пераўвасабляецца: ён прамаўляе запальна, але па змесце яго прамова — прыкладна такі самы набор папулісцкіх штампаў, што і ў дзейнай улады, толькі з іншым знакам. Тут я ўпершыню ў Беларусі сутыкаюся з фальшам, дрэнным густам.

Журналістка завітвае ў сталічную галерэю «Ў», сустракаецца з Алесем Пушкіным, размаўляе з беларускімі бізнэсоўцамі — ад праўладнага касметычнага магната Віктара Цярэшчанкі да братоў Дайнекаў, стваральнікаў знакамітай «Крамбамбулі»: «Гаспадары вытворчасці — тры лагодныя браты-асілкі, тры таўстуны. Гэта іх сямейны бізнэс. Ні вонкава, ні па паводзінах яны зусім не падобныя да савецкіх людзей — хутчэй нагадваюць нейкіх фальклорных чэхаў ці баварцаў. Гледзячы на іх, думаеш, што ў якасці нацыянальнага сімвалу Беларусі больш за ўсё падыходзіла б добрае цёмнае піва».

Асобна кавалкі тэксту Юліі Вішнявецкай глядзяцца банальна, амаль прымітыўна — добрыя машыны, роўныя дарогі, традыцыі, не падобныя да расійскіх (на Радуніцу ўсе ідуць на могілкі), звычкі, не падобныя да расійскіх (парадак на вуліцах), інтэлігенцыя, не падобная да расійскай, масава заангажаваная ў палітыку. Але ў цэлым гэты тэкст варты ўвагі. Па ім відаць: расійскі чалавек пакрысе ўсведамляе, што Беларусь — гэта, як мінімум, не зусім Расія. А то і ўвогуле... Вось, напрыклад, сцэнка з Гродна:

«На пешаходнай Савецкай вуліцы сустракаем групу нефармалаў.

— Народ, патлумачце чалавеку, чым Беларусь адрозніваецца ад Расіі! — крычыць Даша.

— Ды нічым. Славяне і ёсць славяне...

— Адсутнасцю пасярэдніка паміж бізнэсам і дзяржавай, — фармулюе тлусты праграміст з хаерам.

— Усё фігня. Флікерамі, — адказвае дзяўчына ў экстравагантным берэце, слухаўках і акулярах на паўтвару.

— Чым-чым?

— Ты што, не ведаеш? У нас усе па начах павінны насіць флікеры. Гэта такія маленькія штучкі, якія свецяцца, — яны прымацоўваюцца да вопраткі, каб машына на цёмнай дарозе цябе не задушыла. Прадаюцца ў любым шапіку, старэйшы сын прэзідэнта іх вырабляе.

— А калі не будзеш насіць флікер?

— Штраф, вельмі сур'ёзны.

— І вы носіце?

— Не, вядома, мы што, ідыёты?

— Трэба паказаць чалавеку флікер! Шчас знойдзем, — натхняецца Даша. — Гэй, народ, у вас ёсць флікеры? — звяртаецца яна да мінакоў.

— Ды ну, нашто гэта трэба.

— А ў вас, рабяты, ёсць?

— Не, прабач, дома пакінуў...

— Вось бачыш, Юля, бачыш! — Даша чамусьці прыходзіць у шалёнае захапленне. — Ні ў кога няма, Юля, ніхто іх не носіць, ніхто не правярае, ніхто, ты разумееш?

У пошуках чалавека з флікерам мы паступова набліжаемся да вакзала, дзе мне належыць сесці на поезд і з'ехаць у Мінск. Нарэшце я бачу двух маладых людзей з флюарэсцэнтнымі пасачкамі на рукавах.

— Гэта флікеры? — запытваюся я ў нефармальнай дзяўчыны.

— Не, — яна цягне мяне за рукаў. — Гэта міліцыянты».

**Агляд расійскай прэсы падрыхтаваў Алесь Кудрыцкі**

# лукашэнказнаўцы

гісторыі, паказанняў сведак, псіхалагічных сцэн, аўтар адкрывае схаваны ад людзей ценевы бок беларускага рэжыму», — пазначана ў анатацыі. Звышэмацыйная кніга на мяжы — ці нават за мяжой — фола. У тэксце прысутнічае ненарматыўная лексіка. Кніга выйшла ў 2005 годзе.

• **«Народны тэлевізар», «Пацалунак прэзідэнта ў розныя месцы»**

Аўтар — Уладзімір Падгол. Брашура, якая перажыла восем перавыданняў і стала сапраўдным бестселерам, —падборка самых смешных і недарэчных цытат Аляксандра Лукашэнкі.

• **«Лукашэнка. Дыктатар у калгасе Беларусь».**

Аўтар — польскі журналіст Міхал Кацэвіч. Выданне накладам 200 тысяч асобнікаў выйшла ў 2007 дадаткам да часопіса Newsweek Polska. Па характарыстыцы рэдактара выдання, кніга вызначаецца скандальнасцю і «жаўцізной».

• **«Аляксандр Лукашэнка: феномен беларускай мадэлі».**

Аўтар — гісторык Рой Мядзведзеў. Кніга яшчэ толькі з'явіцца ў продажы праз пару месяцаў. Даследаванне прапануе пазітыўную ацэнку дзейнасці Лукашэнкі. Гісторык удакладняе, што перадусім яго цікавіў эканамічны аспект развіцця краіны.

• **«Аляксандр Лукашэнка».**

Дакументальна-мастацкая аповесць была апублікаваная ў 2000 у часопісе «Няміга літаратурная» Уладзімірам Якутавым. Аўтар вядзе замілавана-ідэалістычны аповед пра дзіцячыя гады будучага прэзідэнта і яго юнацтва.

Адсутнасць афіцыйных біяграфій кіраўніка дзяржавы тлумачыцца катэгарычным нежаданнем Лукашэнкі, каб пра яго былі выдадзеныя кнігі.

Сваю ацэнку дзейнасці прэзідэнта ў мемуарах давалі былы прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч, былы міністр замежных справаў Пятро Краўчанка, былы старшыня Вярхоўнага Савета Мечыслаў Грыб, былы лідэр БНФ Сяргей Навумчык і іншыя палітыкі.

**Віталь Несцераў**

# Героі эпохі Грунвальда

**Сярэднявечны рыцар — якім яму даводзілася быць? Піша гісторык Наталля Сліж.**

XIV—XV стагоддзі — гэта час, калі надзвычай былі запатрабаваныя мужныя ваяры. Пра Грунвальдскую бітву 1410 году шмат напісана: перадумовы падзеі, склад войскаў, ход бою. Але мне б хацелася звярнуць увагу на тагачасных ваяроў.

Цяпер юнакі наведваюць рыцарскія клубы. У іх можна навучыцца валодаць зброяй, насіць даспехі. Не так лёгка насіць нават кальчугу. Аднак тое ўсё — гульня. Коштам тут не выступае жыццё, гонар, свабода, краіна.

Калі паглядзець на тагачасныя войны і ў тым ліку на Грунвальдскую бітву, узнікае пытанне: які ж трэ было мець характар, каб ісці ў сечу, з якой вярнуцца жывым было вялікай удачай, а непараненым — шчасце?

Сераднявечныя бітвы ўяўлялі сабой жорсткае відовішча. Бітва 1399 г. на рацэ Ворскле з Ардой, у якой войска Вітаўта было разбітае, апісваецца так: «...Татары з лукаў бесперапынку страляюць. Зміцер Карыбут уварваўся ў сярэдзіну татар, доўга там сек, з коняў татар скідваў, пакуль яго вялікі гмін конямі не спыніў. Крык, гукі як ад марской буры, кулі, стрэлы як дождж, свішчуць, ляцяць з двух бакоў, як пчаліны рой, крычаць, шаблі, мячы грымяць, зброя ад дзідаў трашчыць...»

Ян Длугаш пра Грунвальдскую бітву напісаў наступнае: «...Калі рады сышліся, то падняўся такі шум і грукат ад удараў дзідаў, якія ламаліся аб даспехі, як быццам бы валілася нейкая вялікая пабудова, і такі ляскат мячэй, што яго было чуваць на некалькі міль. Нага наступала на нагу, даспехі біліся аб даспехі, вастрыі дзідаў накіроўваліся ў твар ворагаў. Калі сышліся харугвы, то нельга было адрозніць нясмелага ад мужнага, немагчыма было змяніць месца ці прасунуцца на крок, пакуль пераможца не скідваў з каня ці не забіваў праціўніка і так станавіўся на яго месца... І людзі біліся, і коні іх душылі...»

Як наважыцца пайсці ў гэтае пекла? Першы страх трэ было пераадолець, каб кінуцца ў гэтую «мясарубку». Другі страх — не зламацца пад націскам ворага і не збегчы. Удзельнік Грунвальда Чэх Ян Сарноўскі быў пазбаўлены гонару за адвод войскаў з бітвы.

У бітве шмат залежала ад правадыра. Кіраўнік краіны не мог адседзецца і перачакаць, калі ўсё скончыцца. Ён павінен быў уласным прыкладам весці за сабой ваяроў, разумець сітуацыю, якая склалася на полебітвы, і хутка рэагаваць на любыя змены. Так, летапісы ўсхваляюць дзейнасць Вітаўта як палітыка і як рыцара. Ён узначальваў выправы на Маскоўскае княства, на Арду. Як мужны ваяр праявіў сябе падчас Грунвальдскай бітвы.

Са шматлікіх ваяроў крыніцы захавалі толькі некаторыя імёны ўдзельнікаў бітвы: сыны Альгерда Іван Жэдэвіт і Сямён Лугвен, Жыгімонт Карыбутавіч, Ян (Андрэй) Гаштаўт.

У той час уменне валодаць зброяй вылучала асобу сярод іншых, давала людзям з простага стану магчымасць набыць шляхецтва. Іх было за што вылучаць. Каб ваяваць, мужчына павінен быў валодаць такімі якасцямі, як смеласць, жорсткасць, цягавітасць, уменне кантраляваць свой страх і эмоцыі.

Роля рыцара была запатрабаванай і ганаровай. На ваяра ўскладаліся абарончыя функцыі. Яго абавязак быў змагацца за краіну і, калі трэба, загінуць за яе. Калі ты пайшоў у ваяры, у цябе не было дарогі назад. Здрада і баязлівасць кляймом кладаліся да канца жыцця і няславілі нават нашчадкаў. Паводле тагачасных кодэксаў гонару, рыцар павінен быў прагнуць бітвы, не задумвацца пра ўласную бяспеку і знішчаць як мага болей ворагаў. Прынесеная здабыча падкрэслівала каштоўнасць перамогі.

Прыняцце хрысціянства ачалавечыла воблік рыцара. Перад бітвай чыталіся малітвы, спяваліся гімны. Але гэта не замінала жорстка абыходзіцца з мірным насельніцтвам і палоннымі.

На вайне гераізм адных аказваўся паразай для другіх. Так, Грунвальдская бітва стала яскравай старонкай беларускай вайсковай славы. Можна па-рознаму ацэньваць звычаі тых часоў, але нам варта пераймаць ад іх гонар, а не сарамлівасць, самапавагу, а не закамплексаванасць, ваяўнічасць, а не трыванне.

*Гродна*



**Вітаўт Вялікі. Рэканструкцыя фотамастака Алега Белавусава.**

IN MEMORIAM

# Адкрывальнік старажытнага Палесся

**Памёр археолаг Уладзімір Ісаенка. (15.12.1928 — 30.06.2010)**

30 чэрвеня памёр найвыдатнейшы беларускі археолаг Уладзімір Ісаенка. Ён з той плеяды, якая адрадзіла беларускую археалагічную навуку і стварыла навуковую школу.

Уладзімір Ісаенка нарадзіўся ў Горках Магілёўскай вобласці. Яго бацькі вучыліся ў той час у тамтэйшай Сельскагаспадарчай акадэміі. У 1932 годзе сям'я пераехала ў Мінск.

Яго бацька Фёдар Ісаенка працаваў у Наркамземе — аналагу цяперашняга Міністэрства сельскай гаспадаркі. У 1930-я ён трапіў пад рэпрэсіі, але ацалеў. Пазней, у ваенныя часы, ён пайшоў працаваць аграномам у Мінскую гарадскую ўправу, а затым стаў удзельнікам Беларускай народнай самапомачы.

Падлеткам Уладзя Ісаенка перажыў фашысцкую акупацыю. Не па-дзіцячаму назіральны і памятлівы, ён лёгка ўспамінаў многія падзеі жыцця акупаванага горада, якія ўражвалі сваёй рэалістычнасцю (гл. У.Ісаенка. Жыццё з галавой ў пятлі // Arche. — 1999. № 2).

Вясной 1944 г. яго разам з маці і бабуляй вывезлі ў паўднёвую Германію, дзе як остарбайтар ён па 12 гадзін працаваў на ваенным заводзе, час ад часу трапляючы пад бомбы саюзнікаў, якія перыядычна пляжылі нямецкую ваенную вытворчасць. Затым быў Берлін зімой і вясной 1945 г. з жудасцямі татальнага знішчэння горада і людзей. Хлопцу давялося жыць і хавацца «ў самым цэнтры, за два кварталы ад Ангальтэрбангоф, за тры — ад дому Гімлера, за чатыры — ад Райхсканцылярыі».

Вызваленне з палону прынесла новыя страхі. «Малочны завод, дзе працавала маці ў вайну, — піша ў сваіх успамінах Ісаенка, — яўна мог пацягнуць на калабарацыю, а пра Мінскую гарадскую ўправу я й не кажу». Бацька ў Беларусь не вярнуўся, пасля вайны пераехаў з еўрапейскага выгнання ў ЗША.



**Уладзімір Ісаенка, 2009 год.**

Нечаканае выратаванне прыйшло ад стрыечнага брата маці, які да вайны служыў у НКВД. Ён накіраваў хлопца і яго маці ў Гомель, дзе той змог скончыць школу і паступіць у 1947 годзе ў Гомельскі недінстытут на фізмат.

Па заканчэнні як адзін з найлепшых студэнтаў ён атрымаў рэкамендацыю на выкладанне ў ВНУ, але не скарыстаўся ёю, бо ведаў, якую праверку біяграфіі праходзяць інстытуцкія выкладчыкі. З 1951, атрымаўшы дыплом настаўніка матэматыкі, ён працаваў спачатку ў Шыіцкай, а пазней у Юравіцкай школах Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці.

Менавіта тут, у Юравічах, старадаўнім палескім мястэчку, у маладога настаўніка, а пазней дырэктара школы абудзілася цікавасць да краязнаўства і гісторыі.

Юравічы набылі шырокую вядомасць дзякуючы адкрыццю ў 1929 годзе палеалітычнай стаянкі. На ўскрайне Юравічаў захаваліся і валы гарадзішча — рэшткі невядомага горада X—XIII стст. (меркаванне археолага Алега Іова, якія цяпер вывучае Юравіцкае гарадзішча). А пасярод мястэчка велічна ўзвышаліся муры трохнефнай базілікі — касцёла Раства Найсвяцейшай Багародзіцы (XVIII ст.). Сабраныя Ісаенкам у 1958—1973 г. матэрыялы па гісторыі мястэчка і яго ваколіцаў пазней складуць вялікую рукапісную кнігу «Летапіс Юравіч», частка якой была надрукаваная ў 2000 г.

У канцы 1950-х Ісаенка пачаў арганізоўваць школьныя археалагічныя групы, з якімі праводзіў абследаванне помнікаў археалогіі ўздоўж Прыпяці. У Юравічах ён стварыў школьны музей.

Цікавасць да мінуўшчыны перарасла ў жаданне заняцца археалогіяй прафесійна. У 1961 годзе Ісаенка паступіў у аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук і пачаў працу над кандыдацкай дысертацыяй «Неаліт Прыпяцкага Палесся». Гэта было яшчэ тады, калі многія навукоўцы па-ранейшаму трымаліся думкі пра малую заселенасць Палесся ў глыбокай старажытнасці.

Адкрыўшы сотні новых паселішчаў, Ісаенка бліскуча даказаў, што нізіны Палесся былі адным з найбольш заселеных рэгіёнаў старажытнай Беларусі. Дысертацыю ён паспяхова абараніў у 1973 годзе.

Уражвае аб'ём сабранага ім археалагічнага матэрыялу — гэта сотні тысяч артэфактаў! Калекцыйны фонд Ісаенкі мае каштоўнасць яшчэ і тым, што многія абследаваныя ім помнікі, а гэта найчасцей пясчаныя палескія дзюны, не захаваліся да нашага часу. Іх разбурала меліярацыя, засаджвалі лесам. Пасля Чарнобыль... Палескія калекцыі Ісаенкі можна па праве называць фондам выратаваных каштоўнасцяў.

Ісаенка ўваходзіў у рэдкалегіі многіх энцыклапедый, быў аўтарам мноства артыкулаў (ім напісана больш за 400 артыкулаў для энцыклапедый!).

Вайна, якая пакінула ў памяці падлетка страшны след, не магла не прымусіць усё жыццё думаць пра яе. Ісаенку можна было па праве лічыць адным з самых дасведчаных у Беларусі храністаў Другой сусветнай вайны. Ён працаваў на пасадзе кансультанта ў спецыялізаваным пошукавым батальёне, падрыхтаваў для камандзіраў падраздзялення дапаможнік па методыцы правядзення палявых прац, закладаючы тым самым аснову беларускай ваеннай археалогіі.

Крытыцызм і абачлівасць — найбольш характэрныя рысы Ісаенкі як вучонага. Напэўна, гэтыя асаблівасці не дазволілі яму ў свой час завяршыць многія з распачатых даследчых праектаў. Мауляў, для іх рэалізацыі аднаго толькі жадання мала. Ён імкнуўся рэалістычна глядзець на свет, пасвойму ацэньваў жыццё. У свой час дзякуючы яму я пачаў адкрываць для сябе праўду пра вайну, Катынь, сталінскія рэпрэсіі, народную «партызанку» і многае іншае, што хавалася за шыльдамі савецкай прапагандысцкай гісторыі. А археалогія пачалася для мяне са студэнцкай археалагічнай практыкі на Піншчыне ў экспедыцыі Уладзіміра Ісаенкі на раскопках паселішча Камень.

Дзякуй яму за тыя дарагія часы супольных раскопак і вандровак па Палессі, за шчырыя і карысныя для мяне вечаровыя гутаркі на беразе Пагосцкага возера ды ў прасторных пакоях колішняй старасвецкай школы мястэчка Пагост-Загародскі. Мой светлы ўспамін...

**Мікола Крывальцэвіч**

# Да Бога праз міліцэйскія кардоны

**Будслаўскі фэст — 2010: абсурдныяператрусы на турнікетах і канфіскацыі кніг.**

Засмуцілі турнікеты на ўваходах у мястэчка.

Працэдура праверкі суровымі людзьмі ў міліцэйскай форме сама сабою прыніжальная і аніяк не спрыяе святочнай атмасферы. На аналагічных фэстах у Польшчы, Літве, Чэхіі такога не робяць. А Беларусь тут выглядае проста нейкай краінай павышанай тэрарыстычнай небяспекі, што на самай справе не так. Міліцыянты і самі нервуюцца ад таго маразму, якім ім даводзіцца займацца.

Традыцыя пілігрымак у Будслаў аднавілася за незалежнасцю Беларусі, на пачатку 1990-х.

Ад таго часу тысячы вернікаў з Беларусі і ўсяго свету, каталікоў і праваслаўных, прыходзяць да касцёла пакланіцца абразу Нябеснай Апякункі Беларусі. Фэст у Будславе зрабіўся самым урачыстым і, зрэшты, самым беларускім святам краіны. Кульмінацыя фэсту — урачыстае шэсце з цудатворнай іконай.

Дзясяткі тысяч людзей з запаленымі свечкамі абыходзяць цэнтральную плошчу мястэчка і вяртаюцца да касцёла. Нібы жывая агнявая рака плыве перад базілікай. Гэта прыгожы і велічны момант, які абавязкова трэба пабачыць на свае вочы, каб адчуць дух свята і ўсяе нарачанскае Беларусі.

У Будслаў прыбылі пешыя пілігрымы з Жодзіна, Мёраў, Глыбокага, Полацку, Гродна, Берасця, Мінска і іншых гарадоў і вёсак. Сярод пілігрымаў хадзіў, вітаў іх мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч.

Вечаровую імшу служылі пасучаснаму: са спевамі пад гітару. З'явіліся каталіцкія скаўты, у папярэднія гады іх было меней. Народ слухаў імшу на былым аэрадроме, што каля высознай базілікі, якая калісьці была для самалётаў арыенцірам.

Пасля рыма-каталікоў сваю службу адправілі грэка-каталікі, называныя таксама ўніятамі.

Прыехала раваровая пілігрымка. З Польшчы прыляцела пілігрымка байкераў.

У Будславе разгарнуліся ўсе ўстановы грамадскага харчавання Мядзельскага раёна.

На Краснай плошчы Будслава (па-старабеларуску красны значыла «прыгожы»; плошчы з такой сама назвай ёсць яшчэ ў Ветцы і, усім вядомая, — у Маскве) разгарнуўся традыцыйны кірмаш, дзе апроч смактулекпеўнікаў прадаюць і кнігі, і духоўныя атрыбуты.

Шчыравалі тут і падатковая інспекцыя, і супрацоўнікі КДБ — правяралі гандляроў, трэслі моладзь.

Адзін з тыповых інцыдэнтаў дня — у распаўсюдніка часопіса «ARCHE» на турнікеце сканфіскавалі 9 асобнікаў кнігі «Беларуская навуковая тэрміналогія» і адрыўныя талоны-чэкі для разноснага гандлю. Віна гэтай кнігі была хіба што ў таўшчыні і беларускай мове.

З вядомых людзей на Краснай плошчы наш кар. сустрэў палітыка Паўла Севярынца, філосафа Валера Булгакава, перакладчыка Сяргея Сматрычэнку. Цікава, што іх усіх затрымлівалі людзі ў цывільным «для ўстанаўлення асобы».

Большасць мясцовых вернікаў прыбывае да базілікі бліжэй да поўначы. Колькасць людзей сёлета была параўнальная з той, якая грамадзілася ў Будславе мінулыя гады, — некалькі дзясяткаў тысяч.

Роўна апоўначы ад храма рушыла працэсія вакол плошчы. «Святая Марыя, маліся за нас. Святая Багародзіца, маліся за нас. Святая Панна над паннамі, маліся за нас», — гэты гімн паплыў над рудою Сэрвачу да Вільні і да мораакіяну, і зазіхцелі дзясяткі тысяч знічоў.

Мясцовы мужчына, калі пабачыў з сотню святароў, што выходзілі з касцёла да абраза, сказаў: «А некалі ж іх тут тры чалавекі было».

**Зміцер Панкавец, Мікола Бугай**



Там у вас што? На ўваходах у мястэчка пілігрымаў абшуквалі, як у аэрапорце.


А вы чаго з ракавінай? Ксёндз размаўляе з чалавекам у цывільным.


Вернікаў вітае шчаслівы за іх мітрапаліт.


Пасля доўгай дарогі — шчасце дайсці.

## З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

### Як мяне затрымалі ў Будславе

**Сёлета я рушыў у Будслаў не з пілігрымкай, а на ўласным ровары.** Гэта было мне вельмі зручна, бо з Докшыцаў, дзе жыве мой бацька, да Будслава — не больш як трыццаць кіламетраў.

Прыехаў у Будслаў. Паставіў ровар на падворку мясцовага жыхара ды накіраваўся ў бок касцёла.

Падчас праходжання турнікета заўважаю ў руках аднаго з міліцыянтаў аркушык, на якім выдрукаваныя два фотаздымкі — мой і Паўла Севярынца. Пры надглядзе рэчаў у мяне не знайшлі ні выбухоўкі, ні рэжучых прадметаў, ні нават «няправільных» газетаў. Але міліцыянт усё роўна затрымаў мяне і павёў у пастарунак.

У пакоі пастарунку, куды мяне прывялі, сядзеў чалавек у цывільным. Ён загадаў мне пачакаць, пакуль прыйдзе іншы чалавек. «Іншы» з'явіўся хвілін праз дзесяць і таксама быў у цывільным. Ён зноў зрабіў надгляд маіх асабістых рэчаў. Але зрабіў яго ўважлівей, чым міліцыянты на турнікетах. У выніку я страціў паўтары сотні ўлётак рэлігійнай ініцыятывы «Малітва за Беларусь».

Страціўшы лістоўкі і гумор, я пайшоў у базіліку. Сапсаваны настрой ды пачуццё крыўды не надта спрыялі малітве, таму я пастаяў хвіліны тры на каленях перад галоўным алтаром, папрасіў у Госпада дабраславення для мяне і для Беларусі ды рушыў у бок моста, каб сфатаграфаваць прыбыццё пілігрымак з Віцебскай дыяцэзіі.

Мне не надта хацелася мецьь «глянцавы» рэпартаж з пілігрымамі, якія ўсміхаюцца і махаюць рукамі. І я вырашыў сфатаграфаваць тых, хто найболей дакучае пілігрымам. Маю на ўвазе, канечне, міліцыянтаў, якія скрупулёзна шукаюць у маладзёнаў і старых выбухоўку ды рэжучыя прадметы.

Пасля таго як я зрабіў дзясяткі два кадраў, да мяне падышоў міліцыянт Сяргей Сакалоў ды стаў пераконваць, што сціплая праца міліцыі не вартая, каб пра яе згадвалі ў прэсе. Я стаў даводзіць адваротнае — і міліцыянт папрасіў прайсці з ім у пастарунак. «Вашая асоба падалася мне падазронай», — патлумачыў «страж парадку» прычыну затрымання.

Пасля праверкі дакументаў мяне адпусцілі.

Настрой быў яшчэ горшы. Я вырашыў не заставацца нават на найбліжэйшую імшу і пад грукат навальніцы, што спаткала мяне па дарозе, рушыў на Докшыцы.

Прыехаў да бацькі, зайшоў на Catholic.by і чытаю цытаваную там заяву чыноўніка: «Царква і ўлада сёння працуюць дзеля супольнай мэты».

**Кастусь Шыталь, Докшыцы**

## Сцісла

**За добры канцэрт у Гамбургу «Ляпісам» павысілі ганарар.** У Нямеччыне каманда Сяргея Міхалка прэзентавала свой альбом «Agitpop». Беларусаў прымалі таксама ў Берліне й Дрэздэне. У нямецкай сталіцы 17 чэрвеня «Ляпісам» давялося адкласці канцэрт на гадзіну. Выступ супаў з адным з матчаў чэмпіянату свету па футболе. Разам з заўзятарамі музыкі глядзелі футбол у дворыку клуба Festsaal Kreuzberg. А пасля ўсе разам адцягваліся пад музыку беларускай каманды. На наступны дзень гурт выступіў у Дрэздэне, родным горадзе Сяргея Міхалка. Беларусы былі хэдлайнерамі на фестывалі Lustgarten. А ў Гамбургу нямецкі арганізатар пасля выступлення адзначыў: «Я адчуў культуралагічны шок!» І ў паўтара разу павялічыў ганарар музыкам.

**3 ліпеня «Ляпіс Трубяцкой»** зайграе на чэшскім фэсце Rock For People, 17 ліпеня — на польска-беларускім «Басовішчы», а 13 жніўня — на венгерскім Sziget.

**Прайшла прэзентацыя кнігі Адама Мальдзіса і Армена Сардарава «Даўняя Беларусь.** З настальгіяй аб мінулым». Гэта нарысы і дыялогі аб беларускіх архітэктурных помніках, традыцыях, абрадах. Кніга-альбом змяшчае яшчэ і 150 фотаздымкаў.




«Такіх кніжак трэба мець больш», — рэзюмаваў на прэзентацыі міністр замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў.

**«Научный антикоммунизм и антифашизм» з серыі кніг «Неизвестная история» выйшаў накладам у тысячу асобнікаў.** Уклалі кнігу гісторык Анатоль Тарас і філосаф Аляксандр Грыцанаў.

**Выйшаў дэбютны альбом Юры Дземідовіча.** «Кто бы вы думали?!» склалі 11 песняў. Адна з іх, «Чароўны кролік», — пабеларуску. «Мая мэта — данесці, што трэба жыць у радасці, заўжды ўсміхацца», — сказаў удзельнік дзіцячага «Еўрабачання-2009».

**У Мінску прэзентавалі кнігу казак Уладзіміра Караткевіча «Лебядзіны скіт».** Творы выдала дзяржаўная «Мастацкая літаратура».

**Фільм «Ваўкі» перамог на фестывалі беларускіх фільмаў у Брэсце.** Ён атрымаў Гран-пры — «Крыштальны бусел». Журы таксама аднадушна адзначыла якасную беларускую анімацыю.

# Чалавек гасудара

**Аляксандр Апон.**
Апавяданне.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Клетка ў зале судовых паседжанняў, у якую падсудных увялі праз жывы калідор салдатаў, якімі камандаваў злосны, як вымуштраваная нямецкая аўчарка, маёр міліцыі, была зробленая з загартаванай арматурнай сталі з вялікі палец дарослага мужчыны ўтоўшчкі. Яна, пэўна, магла вытрымаць націск раз'юшанага сярэдніх памераў слана, а не тое што некалькіх змардаваных камерай следчага ізалятара напаўгалодных арыштантаў. Але падсудных, замкнуўшы клетку, пакінулі ў кайданках. На гэта звярнуў увагу шмат хто з прысутных у зале, а адзін заходнееўрапейскі дыпламат нават падумаў: «Божа, якія дзікія норавы!»

Суддзя, які з'явіўся ў зале хвілін праз дзесяць пасля падсудных, таксама бачыў, што іх рукі скутыя кайданкамі. Але трымаць невінаватых людзей, пакуль ён не вынес прысуду, у клетцы і кайданках дзікімі норавамі не лічыў. Наадварот: усім сваім выглядам паказваў, што гэта яго ніякім чынам не датычыць, а калі нават датычыць, дык не варта і выедзенага яйка. Суддзя пачаў агучваць прысуд.

Дарэчы, тое, што некалькі дзён таму вёрз пракурор, вінавацячы падсудных, суддзя таксама не лічыў нечым надзвычайным. Хоць, на добры розум і чалавечае сумленне, паслухаўшы хвіліну-другую тую відавочную хлусню і бязглуздзіцу, трэ было ці то выклікаць у суд санітараў, ці то садзіць пракурора ў клетку самога, разам са зграяй памагатых — следчых і іх начальнікаў. Падсудных вінавацілі ў падрыхтоўцы тэрарыстычных актаў супраць высокапастаўленых чыноўнікаў, а таксама ў падпале іх дамоў, аб чым «яскрава» сведчылі пяць патронаў ад вінтоўкі Мосіна ўзору 1891 году, знойдзеных з дапамогай металашукальніка каля хлява ў аднаго з падсудных, і запалкі Пінскай запалкавай фабрыкі на палічцы ў кухні ля газавай пліты ў другога.

«Эх, мала, чорт, доказаў сабраў, мала!» — з прыкрасцю і шкадаваннем думаў суддзя, касавурачыся левым чорным вокам на іржавыя патроны і запалкі, раскладзеныя пракурорам на стале, а правым, зялёным (ён, як хамелеон, мог адначасова глядзець у розныя бакі), — на заходняга дыпламата.

І як у ваду глядзеў: атрымаўшы на рукі раніцай апошняга дня працэсу прысуд, тэрміны якога былі вызначаныя ў Адміністрацыі прэзідэнта, даведаўся, што яго падсудныя выйдуць амаль сухімі з вады, атрымаўшы ўсяго па пары гадоў катаргі замест дваццаці, на якія яны з пракурорам, пачынаючы гэтую справу, разлічвалі. Бо напачатку была каманда — улупіць на ўсю шпулю, каб нават рот разявіць у глухой падваротні баяліся, каб сядзелі як мышы пад венікам і калаціліся ад страху, каб забыліся і марыць пра нейкую там свабоду, роўнасць і братэрства. Бо тут, у гэтай краіне, да скону свету рабства будзе лічыцца свабодай, бяспраўе — роўнасцю, а падхалімства — братэрствам. Але нешта пайшло не так, не склалася, не склеілася. Хутчэй за ўсё, зашкодзіў усё той самы заходнееўрапейскі дыпламат, які прысутнічаў на судзе і ад слова якога шмат што залежала. Галоўным чынам — магчымасць атрымліваць танныя крэдыты, каб не давесці народ да поўнай галечы і ўрэшце паўстання. І на самым версе, у кабінетах Адміністрацыі, вырашылі інакш. І справа, зразумела, была не ў іржавых патронах, тут хапіла б і рагаткі дзесяцігадовага сына падсуднага, каб цалкам даказаць абвінавачанне ў тэрарызме. Не кажучы пра падпал: бо хто з людзей на Зямлі, за выключэннем немаўлятаў ды дзікуноў у амазонскіх лясах, не карыстаецца запалкамі? То бок не з'яўляецца патэнцыйным падпальшчыкам?

Ніякіх доказаў ні пракурору, ні суддзі, каб абвінаваціць чалавека ў якім заўгодна злачынстве, не было патрэбна ў прынцыпе. У сваёй гэтак званай судавытворчай дзейнасці яны кіраваліся не той сістэмай каштоўнасцей, у якой звычайны чалавек меў, акрамя абавязкаў, хоць нейкія, хоць мінімальныя правы, а яе поўным антыподам. У ёй чалавек ніякіх правоў не меў увогуле, а мела дзяржава, для якой чалавек быў нічым — працоўным быдлам.

Дзяржава, што самае цікавае ў гэтай гісторыі, не была нейкай незразумелай субстанцыяй без колеру, паху і смаку, якую ніхто ніколі не бачыў, а толькі мог верыць у яе існаванне, як у Бога на небе; таксама не была яна і цмокам, які прылятаў з-за чорных гор і сіняга мора. Не, пад дзяржавай меліся на ўвазе цалкам канкрэтныя людзі, у першую чаргу чалавек, якога называлі прэзідэнтам гэтай дзяржавы, хаця з такім жа поспехам яго можна было назваць як заўгодна, купка ягоных сваякоў, сяброў і найбліжэйшых паплечнікаў, а таксама асоб, якія займаліся іх аховай і абслугоўваннем. Да апошніх, гэта значыць абслугі, суддзя залічваў і сябе.

— Я чалавек гасудара! — любіў паўтараць ён дзе трэба і дзе не трэба і ажно рос пры гэтым ва ўласных вачах.

«Ды які ты чалавек? — неяк скрывіўся, бы паклаўшы ў рот цэлы лімон, адзін мардаты мужык у кампаніі за горадам, у якой шмат выпівалі і мала закусвалі. — Сабака ты ланцужны, а не чалавек!»

Спачатку суддзя пакрыўдзіўся, нешта крычаў і махаў рукамі перад тварам таго мужыка. Маўляў, я табе пакажу, ты ў мяне заскачаш. Але назаўтра, на цвярозую галаву, асабліва пасля таго як даведаўся, што гэты мужык — буйны капіталіст і стала жыве ў Нямеччыне, вырашыў, што крыўдзіцца няма за што. І насамрэч ён ланцужны сабака.

Іншая справа — з падсуднымі, якія сядзелі ў клетцы і не былі ні буйнымі бізнэсменамі, ні жыхарамі Нямеччыны. А таму павінны былі заскакаць як мае быць, як басанож на прыску.

А калі не ўдалося і тут, яму зрабілася да таго прыкра, нават сціснула ў грудзях і так падскочыў ціск, што ажно забухала ў скронях. Каб неяк супакоіцца і нечым суцешыць сябе, ён пачаў чытаць не выніковую частку прысуду, каб скончыць як мага хутчэй, а ўвесь прысуд цалкам. І чытаць павольна, нудна, перапыняючыся і раз-пораз паглядаючы на чырвоныя, напружаныя твары падсудных, каб як мага зацягнуць працэс і прынесці ім, акрамя маральных, фізічныя пакуты.

* * *

Калі праз некалькі дзён ён даведаўся з інтэрнэту, што ў аднаго з падсудных пасля прысуду спаралізавала правую руку, гэта яго моцна ўсцешыла.

# Знакі прыпынку

**Уладзімір Някляеў.** Запісы

* * *

Дзмітро Паўлычка абсалютна дакладна прачытаў скразную метафару верша «Ляўкі»:

«Уладзімір Някляеў... Яму належаць праніклівай сілы радкі пра тое, як жыў і як пачуваўся ў савецкім часе беларускі прарок, — хвалены ўладай і ёю ж забіты Янка Купала:

Быў страшны Купала, на ім,
Яшчэ даваенным, жывым,
Святочна кашуля гарэла!

Праз гэты вобраз можна ўбачыць і Паўло Тычыну ды Максіма Рыльскага, Уладзіміра Сасюру ды Андрэя Малышку, на якіх гэтаксама гарэла іхняя святочная, прэзідыумная апратка! Вось жа, усё, што за таталітарным рэжымам мела святочнае прызначэнне, — гарэла, пякло, спальвала надламаныя сэрцы. Паэзія Уладзіміра Някляева напоўненая нечаканымі метафарамі, за якімі — пакутная доля Беларусі». (Прадмова Д. Паўлычкі да кнігі перакладаў Святланы Жолаб «Річка — нескінченна», «Кіеў», 2007.)

А вось жа некалі (пры першай публікацыі ў часопісе «Полымя») Анатоль Вялюгін (сам, без мяне) у радках:

«Ён будзе на сходках начных
Спяваць, зратаваных ад кулі
Сяброў абдымаць, на якіх
Святочна палалі кашулі!», —

зрабіў праўкі:

«Сяброў абдымаць — і на іх
Святочна запальваць кашулі!»



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Змяніўся скразны сэнс метафары, якім Анатоль Сцяпанавіч ахвяраваў або дзеля экспрэсіўнасці («і на іх святочна запальваць кашулі» — канечне ж, больш экспрэсіўна, чым «на якіх святочна палалі кашулі»), альбо каб свядома ад скразнога сэнсу адысці. Болей падобна да другога, бо апошнія радкі верша таксама змененыя.

Было:

«Усё гэта будзе пасля.
Усё гэта будзе ніколі.
Пасля — у мальбе і праклёнах,
Ніколі — у спратах віны
Мільёнаў маўклівых, мільёнаў
Жывых і святочна спалёных,
Саснёных, як смутныя сны...»

— а стала:

«Пасля — у мальбе і праклёнах,
Ніколі — у спратах віны...
Адзін і адзіны з мільёнаў,
Адзін і адзіны, спалёны
На ростанях смутных вайны».

«Працую, панімаеш, над паляпшэннем...» — часцяком, калі я заставаў яго над праўкамі рукапісаў, дасланых у рэдакцыю часопіса «Полымя», дзе ён загадваў аддзелам паэзіі, казаў Адмірал, як у літаратурным асяродку называлі Анатоля Вялюгіна, светлая яму памяць. Іншым разам пасля ягонай працы над паляпшэннем у тэксце не заставалася нічога, што б нагадвала арыгінал.

У пошуках праўды страчваеш шчасце.

* * *

Наскрозь рускаму і менавіта па-руску таленавітаму («Я пил из черепа отца за счастье на земле...») Юрыю Кузняцову я неяк даводзіў, што Дастаеўскі хоць і рускі пісьменнік, але беларус з сяла Дастоева, што пад горадам Іванавым, знакамітым сваімі кажухамі. «Чаму ж тады ён пра тое не згадаў нідзе і ніколі?» — спытаў Кузняцоў і быў вельмі здзіўлены, калі я працытаваў яму, узяўшы ў ягонай жа бібліятэцы кнігу:

«Усякая здаровая, зямная сіла верыць у сябе і ў сваю праўду, і гэта ёсць найпершая прыкмета здароўя народнага. Гэтая народная вера ў сябе і ва ўласныя сілы – зусім не застой, а, наадварот, зарука жыццёвасці і энергіі жыцця і ні ў якім разе не выключае прагрэсу і вялікага поспеху. Без гэтай веры ў сябе не выстаяў бы, напрыклад, на працягу вякоў беларускі народ і не ўратаваў бы сябе ніколі...»

* * *

У пошуках праўды страчваеш шчасце.

# Паліткарэктныя сентэнцыі

### Сацыялагічны рэтра-прагноз

У выніку самых свабодных выбараў у 1939 годзе ў СССР перамог бы Сталін, а ў Рэйху — Гітлер. Зразумела, што абедзве перамогі былі б элегантныя... Ну а ў Багдадзе...

### Аб ідэнтычнасці

Вельмі складаная рэч: колькі яе ні змяняеш, усё роўна нічога не атрымліваеш.

### Хто далей уцячэ ад свабоды?

«Уцёкі ад свабоды» — заразная хвароба, якая не лечыцца. Калі ад свабоды бяжыць натоўп — змятае ўсіх...

### Што, урэшце, рабіць з гэтым рэжымам?

А нічога, бо нас не задаволіць змена рэжыму, толькі змена цывілізацыі... той самай, візантыйска-савецкай, з усімі яе прыбамбасамі.

### Рацыяльнасць як нацыянальная рыса беларусаў

Беларусы пакутуюць праз сваю прыродную рацыянальнасць. Калі яны ведаюць, «навошта», то яны абавязкова гэта зробяць. А калі не ведаюць, то слухаюць начальніка, бо ён рацыянальна ім усё растлумачыць.

Беларусы паводзяць сябе вельмі рацыянальна, як мсье Журдэн, што гаварыў прозай, і не падазраюць, як разумна сябе паводзяць. Нармальны беларус здзівіўся б больш за Журдэна, калі б даведаўся, што ён паводзіць сябе рацыянальна, нягледзячы на тое, што рацыянальнасці не існуе наогул...

**Сяржук Блізна**

# Як дзейнічала расійская шпіёнская сетка ў ЗША

**Агенты Федэральнага бюро расследаванняў дзесяць гадоў адсочвалі сетку агентаў—нелегалаў, што жылі ў ЗША пад чужымі пашпартамі.**

Дзесяць падазраваных, у асноўным выхадцы з Расіі, былі арыштаваныя апошнімі днямі ў некалькіх гарадах ЗША. Адзінаццаты — паводле меркавання ўладаў ЗША, кіраўнік сеткі, з пашпартам на імя Крыстафера Мэтсаса — быў затрыманы паліцыяй у аўторак на Кіпры.

Яго вызвалілі пад заставу, нягледзячы на асцярогі амерыканскага ФБР, што ён можа ўцячы. І ён сапраўды тут жа, у сераду, знік.

ФБР адсочвала расійскую агентурную сетку некалькі гадоў і перахоплівала іх перапіску з «цэнтрам». Афіцыйныя асобы ЗША заяўляюць, што эфектыўнасць сеткі і яе прафесіяналізм былі невысокімі. Шпіёны карысталіся тэхналагічна даволі адсталымі метадамі камунікацыі.

Разведчыкі-нелегалы натуралізаваліся ў ЗША і жылі жыццём звыклых людзей. Яны шукалі знаёмстваў і збіралі інфармацыю пра тых, хто мае доступ да інфармацыі, звязанай з палітыкай і нацыянальнай бяспекай. Гэтыя кантакты потым маглі быць выкарыстаныя для вярбоўкі расійскай Службай замежнай выведкі.

Што вядома пра падазраваных:

**Крыстафер Мэтсас.** Сакрэтны расійскі агент, што жыў за мяжой і прыязджаў у ЗША, каб плаціць агентам, у тым ліку Рычарду Мэрфі, ад якога забіраў грошы і крэдытныя карткі.

У 2004 Мэтсас атрымаў грошы ад расійскіх службоўцаў на чыгуначнай станцыі ў Нью-Ёрку і частку з іх схаваў на поўначы штата.

**Рычард Мэрфі і Сінтыя Мэрфі.** Перадавалі сабраную інфармацыю пра сітуацыю на сусветным рынку золата і стратэгію ЗША што да ядзернай зброі, Ірана і Афганістана яшчэ да візіту прэзідэнта Абамы ў Расію.

Спрабавалі атрымаць працу ва ўрадзе ЗША.

**Доналд Ховард Хэтфілд і Трэйсі Лі Эн Фолі.** Перадавалі расійскім службоўцам інфармацыю што да замежнай палітыкі ЗША, атрыманую ад крыніцаў у Амерыцы.

Хэтфілд, які прыняў амерыканскае грамадзянства, жыў пад імем памерлага канадца.

**Майкл Затолі, Патрыцыя Мілс.** Затолі атрымліваў грошы ад Рычарда Мэрфі, а ў 2006 паехаў з Мілс у Нью-Ёрк, каб забраць грошы, схаваныя Мэтсасам.

**Хуан Ласара, Вікі Пелаэс.** Спрабавалі здабываць інфармацыю з дапамогай амерыканскіх крыніцаў, але расійцаў не задавоexternal задаволіла якасць справаздачаў Ласара. Паехалі ў Паўднёвую Афрыку, каб перадаць паведамленні расійцам і атрымаць ад іх грошы.

**Міхаіл Семянко.** Спрабаваў таемна перадаць электронныя паведамленні праз прыватныя бяздротавыя сеткі і атрымаў ад амерыканскага агента, які ўдаваў расійскага, складзеную газету з $5000 наяўнымі ўнутры.

**Эн Чэпмэн.** Абменьвалася сакрэтнымі электроннымі паведамленнямі з расійскімі службоўцамі. Атрымала фальшывы пашпарт ад удаванага «расійскага» агента для перадачы яго іншаму агенту.

**КаМ; паводле Wall Street Journal**



**Міхаіл Семянко быў адзіным, хто дзейнічаў пад славянскім імем. Фота з сайта «Аднакласнікі».**



**Эн Чэпмэн, рудавалосая красуня, была адной з нелегалак.**

ЗДАРОЎЕ

## Навукоўцы знайшлі, што падаўжае жыццё

**Доўгажыхарства залежыць перадусім ад генаў.**

Вучоныя Бостанскага ўніверсітэта вывучылі ДНК найстарэйшых людзей свету з розных кантынентаў. Па выніках яны распрацоўваюць распрацаваць тэст, які дазволіць людзям даведацца, ці маюць яны перадумовы, каб дажыць да глыбокай старасці.

Даследчыкі вывучылі больш за 1000 чалавек, старэйшых за 100 гадоў. У выніку яны вылучылі набор са 150 унікальных генетычных маркёраў, якія звязаныя з доўгім жыццём. Поўны набор генаў і іх дакладныя функцыі ў падаўжэнні жыцця пакуль невядомыя.

Навукоўцы даўно спрабавалі выявіць генетычны код асобаў, што захоўваюць здароўе да глыбокай старасці. У сярэднім людзі ў развітых краінах жывуць ад 80 да 85 гадоў, дзякуючы паляпшэнню харчавання і медыцынскага абслугоўвання. Але найстарэйшыя з найстарэйшых жывуць на два-тры дзесяцігоддзі даўжэй, часта ў выдатнай фізічнай кандыцыі.

Паводле Los Angeles Gerontology Group, самаму старому чалавеку на свеце цяпер 116 гадоў. Але быў зафіксаваны выпадак, калі чалавек дажыў да 122 гадоў.

Ніхто не ведае дакладнага рэцэпту здаровага даўгалецця. Але гены, якія дапамагаюць кіраваць клетачнымі рэакцыямі на голад, смагу і іншыя стрэсы арганізму, могуць адыграць ключавую ролю ў прадухіленні захворванняў і хранічных хваробаў старэння, сцвярджаюць навукоўцы. Напрыклад, змяненне коду гена, які носіць назву FOX03A, можа патроіць шанцы чалавека перасягнуць 100-гадовы ўзрост.

Бясплатны тэст будзе змешчаны на агульнадаступным сайце праграмы New England Centenarian Study.

**КаМ; паводле Science**

НАВУКА

## Звярынец з таго свету

**Вымерлыя віды жывёлаў можна будзе вярнуць з нябыту.**

Намаганні для гэтага прыкладаюць спецыялісты заапарка Сан-Дыега і Даследчага інстытута імя Элен Скрыпс у Каліфорніі.

Яны плануюць стварыць новых асобін гэтакіх відаў, ператвараючы замарожаныя клеткі іх арганізмаў у сперматазоіды і яйкаклеткі.

На канферэнцыі Міжнароднага таварыства па даследаванні ствалавых клетак у Сан-Францыска прадстаўнік інстытута доктар Жанна Лорынг і яе калегі расказалі пра вынікі сваёй працы: навукоўцам удалося атрымаць індуцыраваныя плюрыпатэнтныя ствалавыя клеткі, здольныя ператварыцца ў клеткі любога тыпу, з замарожаных клетак скуры самца мадрыла (Mandrillus leucophaeus), віду прыматаў, якія жывуць у Нігерыі, Камеруне і Экватарыяльнай Гвінеі і знаходзяцца пад пагрозай выміранння. Канчатковая мэта навукоўцаў — атрымаць з гэтых клетак сперматазоіды і яйкаклеткі.

«Гэтак можна будзе насамрэч разводзіць жывёл, якія ўжо мёртвыя», — кажа Лорынг.

Навукоўцы збіраюцца выкарыстоўваць клеткавы матэрыял, сабраны ў рамках праекту «замарожаны заапарк», што рэалізуе заапарк Сан-Дыега. Адмыслоўцам удалося сабраць узоры тканак ад 8,4 тысячаў асобінаў, якія прадстаўляюць больш за 800 відаў. Яйкаклеткі ды сперматазоіды, паводле задумы навукоўцаў, можна будзе выкарыстоўваць для падтрымкі генетычнае разнастайнасці ў межах праграмаў развядзення жывёлаў у няволі.

А ў перспектыве — узнаўляць любыя зніклыя віды.

**СХ паводле New Scientist**



ЛЮБОШЧЫ

## Як утаймаваць у сабе Атэла, альбо Карані рэўнасці

**Мужчына баіцца страты генаў, а жанчына — карміцеля.**

Пра тое, што рэўнасць дужа псуе жыццё, ведаюць усе, хто хоць раз яе адчуваў.

Навукоўцы сцвярджаюць: рэўнасць — гэта рэакцыя свядомасці на атрыманую пагрозу, рэальную ці ўяўную. Што прымушае нас раўнаваць? Чаго мы баімся?

У мужчын найбольшы страх выклікае фізічная здрада, а ў жанчыны — «эмацыйная», «духоўная». Эвалюцыйная псіхалогія тлумачыць гэта тым, што, выхоўваючы дзіця ад іншага самца, мужчына тым самым не зможа перадаць нашчадкам свае гены. Жанчына ж, у сваю чаргу, проста баіцца застацца без карміцеля.

Каб супакоіць у сабе рэўнасць, найперш трэба зразумець, што гэта ірацыянальнае і контрпрадуктыўнае пачуццё. Яно не здольнае спыніць здраду ці папярэдзіць яе. Каханне, клопат, працавітасць, спакой — вось сапраўдныя гаранты захавання адносінаў. Называць жа што гадзіну мужу і паведамляць яму, дзе вы цяпер і дзе будзеце праз гадзіну, бессэнсоўна. Усё адно вы не прывучыце яго рабіць тое самае.

**Паводле superstyle.ru**



## Навукоўцы вынайшлі першы мужчынскі аральны кантрацэптыў

**Ён блакуе не тэстастэрон, а адзін з апладняльных бялкоў.**

Ізраільскія навукоўцы вынайшлі першы ў свеце мужчынскі аральны кантрацэптыў. У адрозненне ад супрацьзачаткавых таблетак для жанчын, прэпарат не ўтрымлівае камбінацыі тэстастэрону і прагестэрону, што блакуе здольнасць жанчыны да зачацця. Механізм дзеяння навінкі заснаваны на тым, што сперма страчвае бялок, неабходны для апладнення яйкаклеткі. Мяркуецца, што дадзены прэпарат мужчына павінен будзе прымаць толькі адзін раз на тры месяцы. Перавагай дадзенага прэпарату, на думку навукоўцаў, з'яўляецца адсутнасць значных пабочных эфектаў, уласцівых жаночым аральным кантрацэптывам. Чакаецца, што таблеткі паступяць у продаж у найбліжэйшыя тры гады.

**Паводле telegraph.co.uk**

## Чым даўжэй пара глядзіць тэлевізар, тым радзей мае якасны сэкс

**Блакітны экран становіцца заменнікам інтымнага жыцця.**

Чаму так адбываецца? Нейрафізіёлагі тлумачаць гэта наступным: працэс узбуджэння адбываецца за кошт выкіду ў арганізм гармонаў. Падчас прагляду тэлевізара выпрацоўваюцца дакладна такія ж гармоны, але пастаянна і маленькімі порцыямі. У выніку пачуцці і жаданні незаўважна прытупляюцца — на сэкс іх проста не хапае.

Блакітны экран становіцца заменнікам інтымнага жыцця. Асабліва гэта тычыцца жанчын, прырода якіх абумоўлівае вастрэйшую рэакцыю на хваляванні і раздражненні.

**ГК; паводле beautyblog.ru**

# Басовішча

**16—18 ліпеня** ў лясах Беласточчыны пройдзе фестываль музыкі маладой Беларусі «Басовішча–2010». Будуць **«Тройца»**, **«Гурзуф»** і **«Адыс Абеба»**, упершыню плануе ўзяць удзел **«Ляпіс Трубяцкой»**.



АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

## Бясплатных віз на «Басовішча» сёлета не будзе

Арганізатары фестывалю не здолелі дамовіцца з польскім консулятам.

Найбуйнейшы беларускі рок-фэст «Басовішча» ладзіцца недалёка ад беларускай мяжы ў Польшчы з пачатку 90-х.

21-е Басовішча пройдзе ў эксперыментальным фармаце. Упершыню за многія гады на сцэну фестывалю не выйдуць традыцыйныя для яго хэдлайнеры — NRM, «Крама» і «Нейра Дзюбель», аднак упершыню прыедзе «Ляпіс Трубяцкой». 6 маладых гуртоў пазмагаюцца за галоўны прыз — 10 гадзінаў запісу ў польскай студыі Rembrandt і 1000 даляраў.

**generation.by**

## Купляеце на распродажах? Вывучыце хітрыкі гандляроў!

Гандлёвая інспекцыя Польшчы, вывучыўшы спосабы прамоцыі, высветліла, што чвэрць з іх скіраваная на тое, каб зарабіць на кліентах.

Найбольш часта прадаўцы выкарыстоўваюць наступны прыём: яны паведамляюць пра 20-, 30-, 50- ці нават 70-працэнтныя зніжкі, змяшчаючы на цэтліку закрэсленую ранейшую цану, а побач — новую. Але калі б кліенты ведалі цану тавару перад распродажам, яны б убачылі, што яна роўная новай (каля 6% разгледжаных выпадкаў), вышэйшая за тую, якая была, калі тавар з'явіўся ў краме (каля 1,5%), або што тавар па ранейшай цане ніколі не прадаваўся або не прадаваўся непасрэдна перад пачаткам прамоцыі (каля 24%).

Вельмі часта бывае так, што ўладальнікі крамаў абвяшчаюць распродаж з прычыны ліквідацыі крамы. Такая інфармацыя часам вісіць некалькі месяцаў або з'яўляецца ў адной і той жа краме некалькі разоў на год.

Часта таксама да нейкага прадукту на распродажах прыкладаецца «падарунак». Рэклама крычыць, што вы атрымліваеце на 20% больш шампуню, соку, — але мала хто з пакупнікоў адзначае, што цана такога прадукту вышэйшая за цану таго, дзе «падарунка» няма. «Бясплатны» прадукт на справе зусім не бясплатны.

Яшчэ адзін хітрык — мультыпакоўка. Калі пералічыць цану, напрыклад, кожнай бутэлькі вады ў адной упакоўцы, атрымаецца, што той жа тавар, купленыя асобна, насамрэч былі б таннейшыя.

**КаМ паводле gazeta.pl**

## КАНЦЭРТЫ

### Зміцер Вайцюшкевіч

**20 ліпеня ў Малой зале к/з «Мінск»** адбудзецца традыцыйны летні канцэрт Змітра Вайцюшкевіча, прысвечаны ягонаму дню народзінаў. Музыка парадуе сваіх слухачоў найлепшымі і новымі творамі. Квіткі каштуюць 25—35 тысяч рублёў. Каса к/з «Мінск» (т.: 328–66–38 — гарадскі), каса ў пераходзе каля ГУМа (побач з «Макдональдсам»). Даведкі праз т.: (29) 649–08–88.

### Madera Hard Blues

**10 ліпеня ў паб-клубе «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — Madera Hard Blues. **Пачатак а 18-й.**

## ВЫСТАВЫ

### Гарадскія замалёўкі

**У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47) да 29 ліпеня** працуе фотавыстава Генадзя Карчэўскага «Гарадскія замалёўкі». Генадзь Карчэўскі — вядомы фотамастак у тэхніцы «змазанага кадра» і таксама «рэзкага кадра з размытымі аб'ектамі».

### Беларускія ўзоры

**У музеі беларускага народнага мастацтва (Раўбічы) да 31 жніўня** працуе выстава «Беларускія ўзоры»: пляценне з прыродных матэрыялаў, кераміка, аплікацыя саломкай, ручная коўка, разьба па дрэве.

### Свет з вышыні

**У Доме-музеі Ваньковічаў (вул. Інтэрнацыянальная, 33а) да 20 верасня** працуе выстава маляваных картаў Рубена Атаяна «Свет з вышыні .

### 9 ліпеня — Мастацкая выстава «Грунвальд за смугою часу»

600–гадовы юбілей Вялікай Перамогі прынёс новыя творы і новае таленавітае прачытанне дзвюх важных тэм у нашай айчыннай гісторыі. **9 ліпеня 2010 а 17-й у дворыку Літаратурнага музея М.Багдановіча** адбудзецца музычны фэст, **а 18-й** — урачыстае адкрыццё выставы. Выстава будзе экспанавацца **да 1 жніўня 2010**.

### Выстава ілюстрацыяў

**У Музеі гісторыі беларускай літаратуры (вул.Багдановіча, 13)** працуе выстава ілюстрацыяў да кнігі казак Уладзіміра Караткевіча «Лебядзіны скіт».

Recha
10 ліпеня



## ІМПРЭЗЫ

### Тыдзень касцельнай музыкі

Секцыя касцельнай музыкі пры Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў Беларусі ў супрацы з Акадэміяй музыкі **да 9 ліпеня** праводзіць IX Тыдзень касцельнай музыкі. Тыдзень касцельнай музыкі будзе ўключаць: майстар–класы па адзначаных кірунках; 9 ліпеня — заключны канцэрт IX Тыдня касцельнай музыкі (усе мерапрыемствы — **у Катэдры (пл. Свабоды, 9)**.

### Грунвальд

**15—18 ліпеня ў Польшчы** пройдуць святкаванні, прысвечаныя 600–годдзю Грунвальдскай бітвы. **Ля Дуброўна (Грунвальда, Жальгірыса)** адзначаць юбілей перамогі беларуска–літоўска–польскага войска над Тэўтонскім ордэнам. Тэатралізаваныя шоу з удзелам Ягайлы і магістра фон Юнгінена з коннымі харугвамі, рыцарскім турнірам, фаер–шоу, канцэртамі сярэднявечнай і народнай музыкі і збудаваны горад рамеснікаў. І, вядома, **17 ліпеня ў 14.00** — грандыёзная інсцэнізацыя векапомнай сечы, якая, дарэчы, не абыдзецца без беларускіх харугваў пад «Пагоняй». Разам чакаюць прыбыццё каля 5 тысяч рыцараў (нагадаем, у сапраўднай бітве ўдзельнічала ўсяго толькі ў 12 разоў больш).

## ТЭАТРЫ

**7 ліпеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Па зялёных гурбах акіяна»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»
**Тэатр оперы і балета** — «Папялушка»
**Тэатр імя Горкага** — «Злоўлены сеткай»

**8 ліпеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дарога на Віфлеем»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»

**9 ліпеня**

**Тэатр юнага гледача** — «Вандраванне ў княства Сноў»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

**10 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце лепш»

**11 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Рускія вадэвілі»

**12 ліпеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»
**Купалаўскі тэатр** — «Тэатраманія»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Зіма»

**13 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Утаймаванне наравістай»
**Купалаўскі тэатр** — «Сымон–музыка»
**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Варшаўская мелодыя»

**14 ліпеня**

**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»
**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»

**15 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»

**16 ліпеня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Палёты з анёлам»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Тэатр імя Горкага** — «Распуснік»

**17 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Адзіны спадкаемца»

**18 ліпеня**

**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»
**Купалаўскі тэатр** — «Пінская шляхта»

## КІНО

### Выбар між вампірам і ваўкалакам

**Прыцемкі. Сага. Зацьменне** (The Twilight Saga: Eclipse)
ЗША, 2010, каляровы, 124 хв.
**Рэжысёр:** Дэвід Слэйд
**Ролі выконваюць:** Крыстэн Сцюарт, Роберт Пацісан, Тэйлар Лотнэр, Білі Бэрк, Эшлі Грын, Джэксан Рэтбоўн
**Жанр:** Падлеткавая мыльная опера, замаскаваная пад фільм жахаў
**Адзнака:** 4 (з 10)




Сіэтл ахоплены масавымі забойствамі. Помслівая вампірка збірае армію, каб пакараць дзяўчынку Бэлу і ейнага сябра Эдварда Калена. А гераіня ў цяжкім роздуме: хто падабаецца ёй болей — арыстакратычны вампір Эдвард ці мускулісты ваўкалак Джэйкаб?..

Містычныя героі з пяшчотай чытаюць дзявочыя думкі, адгадваюць усе ейныя сненні. Ударная сцэна: напаўаголены Джэйкаб саграе гераіню сваім целам, а арыстакрат Эдвард распавядае, што не можа без гераіні жыць...

**Андрэй Расінскі**

## УІК-ЭНД

### Вадаёмы, закрытыя для купання і адпачынку

Цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя забараніў купанне ў чатырох вадаёмах Брэсцкай вобласці — зона адпачынку возера Кацера Камянецкага раёна, пляж ракі Лясная ў Камянцы, вадаём аздараўленчага лагера «Чайка» Ляхавіцкага раёна, месца адпачынку каля вады вёскі Альшаны Столінскага раёна.

У Віцебскай вобласці забарона на купанне распаўсюджваецца на чатыры зоны адпачынку Полацкага раёна: азёраў Янава, Шчаты, Гомель, Суя.

У Гомельскай вобласці закрытыя 12 зон адпачынку: каля вадаёмаў Буда-Кашалёўскага раёна населеных пунктаў Камунар, Дуравічы, Крыўск, Кашалёва, Чырвонае Знамя, Патапаўка, а таксама зоны адпачынку ў гарадскім парку «Перамога» горада Калінкавічы, на возеры «Камарына» горада Рагачова, на рацэ Дняпро ў другім мікраёне Рагачова, а таксама ў раёне ратавальнай станцыі Рагачоўскага раёна, пляжы «Камяга» і «Гарадскі» Добруша на рацэ Іпуць.

У Магілёве закрытая зона адпачынку гарадскога пляжа на рацэ Дняпро.

# Пан ці прапаў з кітайскім тэлефонам

### Мабільнікі на 2 сім-карткі за $100 — браць ці не?

Сучасныя карыстальнікі мабільнай сувязі ўсё часцей лавіруюць паміж некалькімі аператарамі. Напрыклад, Velcom — для размоў з калегамі па працы, а МТС — з сям'ёй.

Трымаць два мабільныя тэлефоны нязручна, яны так і імкнуцца згубіцца ці разрадзіцца адначасова. Апараты, якія дазваляюць карыстацца адразу дзвюма сімкамі, раней былі прадметам раскошы. Высокая цана разам з ненадзейнасцю і складанасцю рамонту адштурхоўвалі абанентаў ад іх.

Сітуацыя змянілася карэнным чынам са з'яўленнем недарагіх кітайскіх тэлефонаў ад невядомага вытворцы. Як бы смешна ні гучала, але даведацца, якая кампанія зрабіла апарат, амаль немагчыма. Кітайцы «косяць» пад еўрапейскія і амерыканскія брэнды. Так на рынак трапілі «неданокіі» і «недаайфоны». Прапанова зашкальвае. Інтэрнэт-аб'явы, як і рынкі кшталту мінскіх Ждановічаў, перапоўненыя мабільнымі «кітайцамі».

Іх невысокая цана — каля $100 — абумоўленая таннай працоўнай сілай азіятаў. Што застаецца ад вядомага арыгінала? Выгляд. А вось унутры — сапраўдны вэрхал. Распрацоўшчыкі прытрымліваюцца жалезнага правіла — чым больш функцый, тым лепш.

Купіць кітайскую копію тэлефона — вялікая рызыка. Нягледзячы на тое, што мабільнікі ўдасканальваюцца ўвесь час, ніхто не гарантуе, што менавіта ваш апарат акажацца працаздольным. Якія перавагі і недахопы маюць апараты?

### Пазітыў

Самае галоўны аргумент у падтрымку неданокій — цана. Больш нідзе не знойдзеш тэлефона на дзве сім-карты, з тэлевізарам, дыктафонам, радыёпрымачом, фота- і відэакамерай за $100-150. Прытым што сапраўдны айфон каштуе ад $500... Ды ў дадатак з падтрымкай картак памяці, сэнсарным дысплэем і блютусам!

**Хоць некаторыя прадаўцы і даюць за дадатковую аплату так званую гарантыю, сэрвісных цэнтраў па рамонце такіх мабільнікаў няма.**

Мабільнікі проста перапоўненыя ўсялякай прыемнай драбязой накшталт ліхтарыка і відэапрайгравальніка.

Тэлевізар, у існаванне якога мала хто верыць, працуе даволі ўпэўнена. Напрыклад, у Мінску антэна ловіць восем тэлеканалаў, хоць і ў не вельмі добрай якасці. Чэмпіянат свету хутчэй не глядзіш, а слухаеш. Але і гэтага дастаткова, каб хутчэй за астатніх даведвацца апошнія навіны на вуліцы ці ў транспарце.

### Негатыў

Як ні прыемна ашчаджаць грошы пры куплі, варта памятаць пра небяспеку застацца праз тыдзень з непрацоўным мабільнікам. Кітайскі тэлефон — кот у мяху. Ніхто не ведае, якога выбрыку ад яго чакаць. Можа, заўтра ўключыцца, а можа, і не. Хоць некаторыя прадаўцы і даюць за дадатковую аплату так званую гарантыю, сэрвісных цэнтраў па рамонце такіх мабільнікаў няма.

На камерах такіх тэлефонаў звычайна напісана «5 мегапікселяў» ці нават «8 мегапікселяў». Прытым што ў рэальнасці здымкі выходзяць у жахлівай якасці і памерам 640*480. Тэлефоны пакуль што не падтрымліваюць платформы Java, таму гульні ці праграмы кшталту ICQ ці Opera на тэлефоне не запусцяцца. Дый інтэрнэт працуе не заўсёды. Настройкі для яго трэба шукаць асобна. Якім бы моцным ні быў акумулятар, доўгі прагляд тэлевізара пасадзіць яго за гадзіну.

Метадам спроб і памылак народныя ўмельцы робяць мабільнікі зручнейшымі — знаходзяць якаснейшыя прашыўкі і корпаюцца ўнутры апарата. Для студэнта-самавука набыццё кітайскага мабільніка стане добрай эканоміяй і бясконцым полем для дзейнасці, а вось тым, хто цэніць найперш камфорт у карыстанні, наўрад ці спадабаецца.




**Яўген Васількоў**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Кальрабі фаршаваная

**6—8 штук кальрабі, 2 лыжкі масла, 2 яйкі, 200 г астаткаў цялячай смажаніны або нырак, 0,5 французскай булкі, трохі шпіку, 2 лыжкі смятаны, трохі солі. Да гэтага масляны соус.**

Абраць і прамыць маладую кальрабі; зрэзаць верх і асцярожна выбраць у кожнай кальрабі сярэдзіну, каб стварыліся досыць вялікія і круглыя дзіры для запаўнення фаршам. Вынятую сярэдзіну дробна пасекчы, падсмажыць на масле да мяккасці, дадаць дробна пасечаную цяляціну (смажаніну) або ныркі, шпік, нацертай і падсмажанай у масле булкі, пару яек, смятану, пасаліць усё і добра перамяшаць. Прыгатаваным фаршам напоўніць кальрабі, закрыць кожную зрэзаным верхам, абвязаць моцнай ніткай, размясціць адна каля другой у рондлі і патушыць да гатоўнасці. Пры падачы ніткі зняць, заліць кальрабі масляным соусам.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854 г.**
**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

#### ВІТАННІ

**Віншуем кіраўнічку** Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» Алену Макоўскую з днём народзінаў. Жадаем моцнага здароўя, вытрымкі і аптымізму.

#### КАНТАКТЫ

**Асобаў, якія фільмавалі** на фота і відэа наш шпэктакль «Здані з батлейнай скрыні» ў Наваградку, вельмі просім, падзяліцеся з намі здымкамі або сплатай за іх. Гэтак вы ўшануеце нашы аўторскія правы, якія пагвалцілі, здымаючы без дазволу. Т.: (033) 638-98-03. Пан Скіргайла

#### НАБУДУ КНІГУ

**«Беларусь» Кастуся Тарасава.** Гістарычнае падарожжа для дзяцей. Мінск, «Лекцыя», «Бацькаўшчына», 2000. nikolay@tut.by, Velcom: (044) 714-72-33

#### СПАЧУВАННІ

**Смуткуем разам з Валерам Булгакавым** з прычыны вялікага гора — смерці бацькі, Уладзіміра Булгакава, пасля доўгай пакутлівай хваробы. Сябры

**Шаноўны Валер Булгакаў!** Прыміце самыя шчырыя спачуванні. Трымайцеся. Смуткуем разам з Вамі. Юрась Каласоўскі

**Прэзідыум** Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады) выказвае глыбокае спачуванне старшыні БСДП Анатолю Ляўковічу з прычыны гора, якое напаткала яго, — смерці маці.

**Прэзідыум** Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады) выказвае шчырыя спачуванні сябрам БСДП Аляксандру і Сяргею Ляўковічам з прычыны гора, якое напаткала іх, — смерці бабулі.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

## У Гродне пару сокалаў назвалі ў гонар караля і святой

### За жыццём птушак можна сачыць у сецівe ў рэжыме онлайн.

Пары пустэльгаў, што пасялілася на фасадзе бернардынскага касцёла ў Гродне, вырашылі даць імёны.

Самку назвалі Аленай, у гонар святой, за статуяй якой жывуць птушкі. Самца — Стэфанам, у памяць пра караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя.



Пра гэта расказаў старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Зміцер Вінчэўскі. Беларусы дзякуючы вэб-камеры назіраюць за іх гняздом.

Летась сокал-пустальга быў названы Птушкай 2010 году. Агульная колькасць віду ў Беларусі ацэньваецца ў 1400—2000 пар.

**СП**

КОЛЫ

## Найлепшыя аўтамабілі — 2010 па версіі кіроўцаў



Чарговае маштабнае даследаванне правяло брытанскае аддзяленне агенцтва J.D. Power. Агенцтва апытала аўтаўладальнікаў, якія набылі свае аўтамабілі больш за год таму і ў сярэднім наездзілі ля 30 000 км. Вялізную анкету запоўнілі 17 200 аўтамабілістаў.

Яны ацэньвалі і надзейнасць, і зручнасць, і камфортнасць машын.

Англічане традыцыйна недалюбліваюць французаў, таму «рэно», «пежо» і «сітраэны» ў даследаванні аказаліся недаацэненымі. Аднак агульныя вынікі ўсё адно ўяўляюць цікавасць.

**Гарадскія мікралітражкі**

| № | Мадэль | Вынік | Месца |
|---|---|---|---|
| 1 | Toyota Aygo | 80.7% | 31 |
| 2 | Fiat Panda | 80.4% | 43 |
| 3 | Smart Fortwo | 80.2% | 46 |
| 4 | Fiat 500 | 79.4% | 52 |
| 5 | Volkswagen Fox | 78.3% | 66 |
| 6 | Citroen C1 | 76.4% | 90 |
| 7 | Chevrolet Matiz | 76.1% | 93 |
| 8 | Kia Picanto | 75.5% | 98 |
| 9 | Peugeot 107 | 75.2% | 99 |
| 10 | Ford Ka | 73.3% | 104 |

**Аўтамабілі D-класа**

| № | Мадэль | Вынік | Месца |
|---|---|---|---|
| 1 | Honda Accord | 83.7% | 5 |
| 2 | Toyota Prius | 83.4% | 6 |
| 3 | Volvo S40 | 82.4% | 11 |
| 4 | Toyota Avensis | 80.6% | 35 |
| 5 | Mazda 6 | 80.4% | 43 |
| 6 | Volvo 50 | 80.2% | 46 |
| 7 | Ford Mondeo | 80.1% | 49 |
| 8 | Volkswagen Passat | 80.0% | 50 |
| 9 | Citroen C5 | 78.8% | 59 |
| 10 | Vauxhall Vectra | 77.3% | 78 |

**Гарадскія кампактныя хэтчбэкі і кампактвэны**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | Honda Jazz | 83.1% | 7 |
| 2 | Toyota Yaris | 83.1% | 8 |
| 3 | Mazda 2 | 81.1% | 26 |
| 4 | Mini | 80.8% | 30 |
| 5 | Skoda Fabia | 80.5% | 37 |
| 6 | Nissan Note | 80.3% | 45 |
| 7 | Volkswagen Polo | 80.2% | 46 |
| 8 | Mitsubishi Colt | 79.5% | 51 |
| 9 | Ford Fusion | 78.9% | 57 |
| 10 | Citroen C2 | 78.6% | 63 |

**Кампакт-прэміум**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | Lexus IS | 83.9% | 2 |
| 2 | Mercedes-Benz C-Class | 82.3% | 14 |
| 3 | Audi A5 | 81.7% | 20 |
| 4 | Jaguar X-type | 81.0% | 27 |
| 5 | BMW 3 Series | 80.7% | 31 |
| 6 | Audi A4 | 80.5% | 37 |
| 7 | Saab 9-3 | 78.6% | 63 |

**Аўтамабілі С-класа**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | Kia Cee'd | 83.8% | 4 |
| 2 | BMW 1 Series | 82.4% | 11 |
| 3 | Skoda Octavia | 82.4% | 12 |
| 4 | Honda Civic | 82.0% | 18 |
| 5 | Volkswagen Jetta | 81.6% | 21 |
| 6 | Volvo C30 | 81.3% | 23 |
| 7 | Mercedes-Benz A-Class% | 81.2% | 25 |
| 8 | Volkswagen Golf | 80.6% | 35 |
| 9 | Audi A3 | 80.5% | 37 |
| 10 | Toyota Auris | 79.3% | 53 |

**Мінівэны**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 | Mercedes-Benz B-Class | 81.4% | 22 |
| 2 | Citroen Crand C-4 Picasso | 80.9% | 28 |
| 3 | Toyota Verso | 80.7% | 31 |
| 4 | Citroen C4 Picasso | 80.5% | 37 |
| 5 | Volkswagen Golf Plus | 80.5% | 37 |
| 6 | Volkswagen Touran | 78.4% | 65 |
| 7 | Renault Scenic | 78.2% | 68 |
| 8 | Ford S-Max | 77.8% | 72 |
| 9 | Ford C-Max | 77.5% | 76 |
| 10 | Renault Grand Scenic | 77.4% | 77 |

## Кемікі



1) Якіх камянёў няма ні ў адной рэчцы?

2) Што можа быць у парожняй кішэні?

3) Што наймілейшае на свеце?

4) Ты стаіш — ён ляжыць, а ідзеш — ён за табою па зямлі сцелецца.

**Сабрала Валянціна Карнялюк**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**




**Афіцэры таксама плачуць. 1 ліпеня ля Нацыянальнай бібліятэкі ва ўрачыстай абстаноўцы адбыўся чарговы выпуск спецыялістаў Камандна-інжынернага інстытута Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Сёлета ўпершыню сярод выпускнікоў, якія навучаліся на дзённай форме навучання па спецыяльнасці «Папярэджанне і ліквідацыя надзвычайных сітуацый», — 8 дзяўчат. У часе цырымоніі выпускніцы не хавалі эмоцый.**




**Улады адзначылі 3 ліпеня шэсцем ветэранаў вайны па праспекце да плошчы Перамогі. Як і заўжды, у дэфілядзе ўдзел бралі дэлегацыі прадпрыемстваў і праўладных суполак. Сёлета выйшлі на парад і так званыя «беларускія казакі» — арганізацыя, сфармаваная на ўзор расійскага казацтва.**




**Іх вярхоўны атаман Мікалай Улаховіч апрануўся Сталіным, хоць той вынішчаў казакоў пад корань.**

**Самы папулярны віцебскі інтэрнэт-партал — незалежныя «Народныя навіны Віцебска», news.vitebsk.cc, выбірае Міс Інтэрнэт. 11 прыгажунь змагаюцца за гэты тытул. Галасаванне працягнецца да 6 ліпеня. Пераможца атрымае пуцёўку ў Крым. У аналагічным конкурсе летась перамагла Кася Сцяпанава, студэнтка Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.**






## Анекдоты

Нарадзіўся, пасля пайшоў у дзіцячы садок, потым у школу, затым скончыў універсітэт, пайшоў працаваць, ажаніўся — і вось ты ўжо са сваімі дзецьмі выходзіш на шпацыр. А бабулькі ля пад'езда ўсё тыя ж самыя...

* * *

Сустракаюцца двое:

— Я чуў, у цябе дачка нарадзілася пазаўчора?

— Так, мы пачалі ўжо збіраць на пасаг!

— А ў мяне ўчора нарадзіўся сын! Пачалі збіраць на ваенкамат!

* * *

Доктар уваходзіць у палату, дзе ляжыць маладая жанчына.

— Добры дзень, раздзявайцеся — мне трэба вас агледзець...

— Але ваш калега ўжо аглядаў мяне і казаў, што я ў добрай форме!

— Так, так, менавіта гэта ён і мне казаў...

* * *

Патлумачце нарэшце, у чым семантычная, эканамічная і палітычная розніца між паняткамі энергетычная імперыя» і «сыравінавы прыдатак»?

* * *

Нішто так не бадзёрыць з раніцы, як своечасова не заўважаны вушак...

## «НН» сто гадоў з вамі

**Клюшчаны Свянцянскага пав.** Без мала людзей любяць у нас сваю мову і стараюцца захаваць яе; кажуць яны, што бацькі, дзяды і прадзеды мовай гэтай гукалі і абыходзіліся ёй. Некаторыя з гэтых людзей казалі мне, што іх бацькі, уміраючы, разам з богаслаўленнем казалі ім шанаваць родную мову і трымацца старых звычаяў, а таксама і яны самі, калі Бог не адбярэ ў апошнія мінуты мовы, перакажуць тое самае сваім дзецям.

**«НН». №28. 1910**

**Камуністы ў дабрачынных сталоўках.** Барысаўскае габрэйскае таварыства «Святло Меноры» ад чэрвеня пачало арганізоўваць бясплатныя штодзённыя абеды пры сталоўцы, што на цэнтральным праспекце Рэвалюцыі, дзе харчуюцца з паўсотні галодных барысаўцаў. Сталымі спажыўцамі дармовага харчу з'яўляюцца не толькі людзі, што начуюць у каналізацыях і сутарэннях, але й звычайныя ветэраны. Некаторыя з іх дагэтуль носяць значкі кшталту «Ударнік камуністычнае працы». Гады ўдарнае камуністычнае працы прывялі да аднаго выніку — поўнае занядбанасці.

**«НН». №27. 2000**

1) Сухіх. 2) Дзірка. 3) Сон. 4) Ценъ.

**Адказы на кемікі са старонкі 15.**

Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

**© НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6350.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 06.07.2010.
Замова № 3242.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614
9 771819 161008 10025